ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарновым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 80 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Замкі тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ўзадатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-01.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . . 10-74
Сакратар . . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 25 ліпеня 1930 г.
№ 171 (3769)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

## Важнейшая задача

У многіх раёнах Беларусі пачалася ўборка. У рэшце раёнаў да яе пачатку засталіся лічаныя дні. Характэрнейшай рысай уборачнай кампаніі зьяўляецца рэстрая клясавая барацьба, ва ўмовах якой яна праходзіць. Весткі з усіх куткоў БССР гавораць аб тым, што кулак праяўляе вялікую актыўнасьць, што ён аказвае зьверскае супраціўленьне нашаму наступленьню.

У сьвятле гэтых фактаў вельмі выразна выступае праваапартуністычны характар думак аб тым, што кулак ужо канчаткова разьбіты, што кулак ужо ліквідаваны. «Кулак яшчэ не дабіты і будзе аказваць шалёнае супраціўленьне пераможнаму руху калектывізацыі. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, патрабуе доўгай, упартай барацьбы з кулаком, сыстематычнай работы над правядзеньнем калектывізацыі і павінна разгортвацца ў поўнай суадносінасьці з ажыцьцяўленьнем суцэльнай калектывізацыі, як яе непадзельная частка». (З рэзалюцыі XVI партзьезду па дакладу т. Якаўлева).

Падобныя думкі аб тым, што кулак ужо ліквідаваны, адмаўляюць абвастраньне клясавай барацьбы, яны ігграюць на руку толькі кулаку—клясаваму ворагу.

Уборачная кампанія гэтага году зьяўляецца адным з рашаючых крокаў у нашай барацьбе за калектывізацыю. Ад пасьпяховага правядзеньня ўборкі, ад правільнага разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасах у вялікай ступені залежыць далейшае развіцьцё калектывізацыі. Асаблівае значэньне ўборачная кампанія мае ў Беларусі. У Беларусі пасьля правядзеньня веснавой сяўбы налічвалася 13 проц. калектывізаваных гаспадарак. Але справа ня толькі ў арытмэтычнай колькасьці, а ў іх удзельнай вазе. Недарма XVI зьезд партыі рэзка выступіў супроць ігнараваньня калгасу ў раёнах нязбожжавых. «Зьезд лічыць недапушчальным ігнараваньне гэтых калгасаў, маючы на ўвазе вопыт разьвіцьця калектывізацыі збожжавых раёнаў, дзе ў мінулым годзе лік калгасаў ня перавышаў ліку калгасаў, якія маюцца цяпер у спажываючай паласе і дзе гэты невялікі лік калгасаў адыграў важнейшую ролю ў далейшым разгортваньні калгаснага руху, паколькі ў асобе калгасаў стваралися ўзоры і прыклады для ўсёй іншай сялянскай масы і ў іх выкоўваліся кадры, якія сталі пры далейшым разгортваньні калгаснага руху арганізатарамі масавай калектывізацыі». (З рэзалюцыі XVI зьезду).

Асноўным зьвяном зараз ва ўсёй нашай рабоце зьяўляецца разьмеркаваньне калгаснага ўраджаю. Гэта пытаньне, якое канцэнтруе і адлюстроўвае ўсе пытаньні, зьвязаныя з арганізацыяй працы ў калгасах, з арганізацыйным і гаспадарчым іх замацаваньнем. У сваіх пастановах XVI зьезд партыі падкрэсьліў, што «рашаючае значэньне для работы партыі ў даны момант атрымлівае задача далейшага ўцягненьня ў калгасы бяднацка-серадняцкіх гаспадарак на дабраахвотных пачатках, праблема арганізацыі працы ў калгасах, разьмеркаваньне ўраджаю ўнутры калгасу, праблема падрыхтоўкі калгасных кадраў, уздым культурнага ўзроўню калгасных мас, перамога дробна-буржуазных хістаньняў унутры калгасаў, усямернае замацаваньне калгасаў, як апорных пунктаў сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы». (З рэзалюцыі [illegible] на сінаваздачы ЦК).

Трэба сказаць, што значна павялічаны ўраджай на калгасных палёх, які выліканы калектыўнай і лепшай апрацоўкай зямлі, паказвае індывідуальніку, што ў калгасе яму забясьпечаны больш вялікі даход, што толькі ў калгасе для яго адзінае выйсьце з тэй бязвыходнай галечы, з якой непадзельна зьвязана для асноўных шматмільённых мас сялянства індывідуальная, раздробленая сялянская гаспадарка.

Варта прывесьці наглядныя факты ўборкі ўраджаю і яго разьмеркаваньня ў калгасе «Расьсьвет Пераможца» (гл. матар'ялы, зьмешчаныя ў сёньняшнім нумары «Зьвязды»). Яны наглядна паказваюць, якіх вялізарных посьпехаў можа дасягнуць калгас пры правільнай арганізацыі працы. Даход калгаснікаў у 3-4 разы перавышае даход індывідуальніка-серадняка. Прыклад «Расьсьвет Пераможца» руйнуюча б'е па ўсёй кулацкай агітацыі, па права-апартуністычным прароцтве.

Правільнае разьмеркаваньне ўраджаю павінна выклікаць і выклікае новую хвалю прыліву ў калгас. Характэрнымі зьяўляюцца такія факты з многіх раёнаў Беларусі. Напрыклад, у калгасе імя Фрунзэ (Полацкая акруга) толькі за апошнія 8 дзён уступіла новых 25 гаспадарак беднякоў і сераднякоў. **Гэта адбылося дзякуючы таму, што гэты калгас правільна наладзіў уборку і разьмеркаваньне ўраджаю.**

Было-б надзвычайнай наіўнасьцю думаць аб тым, што разьмеркаваньне ўраджаю зьяўляецца справай лёгкай, якая можа прайсьці без супраціўленьня клясавага ворага. Гэтак думаць можа толькі безнадзейны апартуністы.

Кулак стараецца ўсімі мерамі зьнішчыць калгасы. Ён агітуе за тое, каб калгас ня ўдаў хлеба дзяржаве, ён агітуе за «разьмеркаваньне хлеба на карню» і г. д. Даць рашучы адпор кулацкай агітацыі, мабілізаваць калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў—індывідуальнікаў для адпору кулаку і яго агітацыі—зьяўляецца задачай партыйных арганізацый.

Партыя і ўрад далі вычарпальныя асноўныя ўстаноўкі ў справе правядзеньня разьмеркаваньня ўраджаю. Гэтыя ўстаноўкі ёсьць у дырэктыўным лісьце Наркамазему і Калгасцэнтру БССР.

Факты гавораць аб тым, што дзе-нідзе, забываюць ад урокаў перагібаў, якія мелі месца ў часе правядзеньня веснавой сяўбы. Трэба памятаць аб дырэктыве XVI партзьезду: «Партыя павінна працягваць бязьлітасную барацьбу з «левымі» антысерадняцкімі перагібамі, якія больш, чым калі, у цяперашні час, іграюць на руку кулаку і праваму апартунізму». Недапушчальна ніякае адміністраваньне, ніякі прымус. Разьмеркаваньне ўраджаю павінна быць праведзена самімі калгаснікамі, згодна іх волі. Недапушчальна рэгламантаваньне і дэкратаваньне спосабу разьмеркаваньня ўраджаю зьверху.

Але гэта зусім не азначае адмаўленьня ад кіраўніцтва партыі і рабочае клясы гэтай важнейшай галіны работы калгасу. Правыя элемэнты на мясцох разумеюць адмаўленьне партыі ад рэгламантацыі, ад дачы канкрэтнага пляну разьмеркаваньня ўраджаю зьверху, з цэнтру, як адмаўленьне ад кіраўніцтва наогул.

Партыя будзе змагацца за правільнае разьмеркаваньне ўраджаю. Такім зьяўляецца разьмеркаваньне калгасных даходаў па колькасьці і якасьці затрачанай працы. Нашай задачай зьяўляецца растлумачыць калгаснікам гэта. Мы павінны дапамагчы выбраць гэтую лепшую з магчымых форм разьмеркаваньня даходаў. Ніякім чынам нельга прымусам, загадам, ці «адміністраваньнем» забараніць калгаснікам выбраць якую-небудзь іншую форму.

Кулак праяўляе надзвычайную гібкасьць у сваёй барацьбе супроць нас. Кулак іграе на дробна-ўласьніцкіх інстынктах і псыхалёгіі калгаснікаў—нядаўніх індывідуальнікаў. Барацьба за правільнае разьмеркаваньне ўраджаю — гэта барацьба з кулаком, за перавыхаваньне калгаснікаў у сапраўдных работнікаў-сацыялістычнай гаспадаркі. «У арцелі не завяршаецца, а толькі пачынаецца дыяцыплінаванне сялян, якія ідуць у сялян сацыялістычнаму будаўніцтву». (З рэз. зьезду).

Трэба накіраваць руйнуючы агонь па правых апартуністых, якія прабуюць падарваць справу сацыялістычнага перавыхаваньня калгаснікаў, якія праводзяць кулацкую праграму.

Пытаньне разьмеркаваньня ўраджаю павінна стаць у асяродку нашай увагі. Трэба даць адпор тым, якія лічаць, што гэта пытаньне чыста арганізацыйнае. Разьмеркаваньне ўраджаю зьяўляецца важнейшым палітычным пытаньнем.

Пасьпяховае правядзеньне дырэктыў партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаю зьявіцца новай вялізарнай перамогай партыі на фронце сацыялістычнага наступленьня.

# УБОРКА ІДЗЕ

**Дасягненьні калгасу „Расьсьвет-Пераможца"—руйнуючы ўдар па кулацтве і яго праваапартуністычнай агентуры. Ударным правядзеньнем уборні і правільным разьмеркаваньнем ураджаю памножым посьпехі калектывізацыі**

## ЛІЧБЫ ПЕРАМОГ

*Як калгас „Расьсьвет-Пераможца" разьмяркоўвае ўраджай*

**Прыбыткі калгаснікаў у 3-4 разы больш, чым у індывідуальнікаў**

**⅓ збожжавай прадукцыі калгас аддае дзяржаве**

Нядаўна «Зьвязда» паведамляла аб ударнай падрыхтоўцы калгасу «Расьсьвет Пераможца» да ўборкі ўраджаю. Калгас дабіўся вялікіх посьпехаў шляхам шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва. Усе калгаснікі абвясьцілі сябе ўраднікамі па правядзеньні ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы. 19 ударных брыгад калгасу «Расьсьвет Пераможца» абавязаліся ўбраць увесь ураджай жыта ў 251 гэкт. за 10 дзён. За 6 дзён калгаснікі ўбралі каля 100 гэкт. сенажаці.

Зараз члены калгасу «Расьсьвет Пераможца» **першымі** ва ўсёй БССР абмеркавалі і прынялі арыентовачны парадак разьмеркаваньня сёлетняга ўраджаю, скарыстаўшы леташнюю практыку і ўказаньні НКЗ і Калгасцэнтру. Цяпер кожны калгаснік прыблізна ведае свой гадавы прыбытак, дасягнуты ў рэзультаце калектыўнай працы і гаспадарчай дзейнасьці калгасу.

На сёпешні дзень калгас яднае 162 сялянскія гаспадаркі. Яго пасеўная плошча складае 674 гэкт. зямлі. Сенажаці калгас мае 114 гэкт. Ураджай разьмяркоўваецца наступным чынам.

Пры падліку валавой прадукцыі калгасу калгаснікі ня ўключылі кармоў—сена, саломы, вікі і інш. па тэй падставе, што жывёла абагулена на 100 проц. Кармы ацэньваюцца ў 50—55.000 руб.

Калгаснікі прынялі арыентовачна пастунную норму ўраджайнасьці з аднаго гэктара: жыта—41 цэнтн.; аўса—10-11 цэнтн.; ячменю—10 цэнтн.; пшаніцы—яравой — 12½ цэнтн.; гароху—50 цэнтн. і г. д.

Валавая прадукцыя калгасу (акрамя кармоў) складае 180.000 руб. З гэтай сумы праўленьне калгасу **перш за ўсё** вылічыла **кошт насеньнага фонду** (17.000 руб. і **кошт збожжавых прадуктаў на ўтрыманьне жывёлы** (10.000 тыс. руб.). 153.000 руб., якія засталіся ад агульнага прыбытку, Расьсьвет Пераможца» разьмяркоўвае наступным чынам:

**Непадзельны капітал вызначаны ў 10 проц.** (15.300 р.); у запасны капітал таксама **10 проц.**; у культурна-бытавы фонд (ясьлі, клюбная работа, утрыманьне неправаздольных калгаснікаў і г. д.) — **17 проц.; 1 проц.** пойдзе ў фонд прэміяваньня лепшых калгаснікаў-ударнікаў. **5 проц.** паказанай сумы будуць разьмеркаваны сярод калгаснікаў адпаведна маемасьці, унесенай імі ў калгас. Ад агульнай сумы прыбытку ў 153.000 руб. **чысты прыбытак складае 67 проц.**

Для пакрыцьця с.-г. падатку, страхоўкі і атрыманых крэдытаў калгаснікі **вызначылі спэцыяльную суму** з іншых крыніц прыбытку: млын, які працуе на нафце, дасьць калгасу 6.000 руб. прыбытку: продаж бракаванай жывёлы на мяса дасьць калгасу 7.400 руб. З гэтых сум 5.000 руб. ідуць па **пакрыцьцё с.-г. падатку і страхоўкі;** 6.000 руб. **на пакрыцьцё крэдытаў** і рэшта на іншыя гаспадарчыя і адміністрацыйныя выдаткі.

У аснову разьмеркаваньня ўраджаю пакладзены **працоўны прынцып.** Працоўная норма будзе ўведзена па 4-разраднай сетцы (ад 75 кап. да 1 р. 50 кап.). У калгасе 312 працаздольных і 402 утрымаўцы (дзеці, старыя і г. д.). Кожны з працаздольных калгаснікаў у сярэднім за год прапрацаваў 302 чалавека-дні (у калгасе ідзе вялікае будаўніцтва і таму калгаснікі працавалі ўзімку). Усіх чалавека-дзён аказалася 59.000. Адпаведныя падлікі і тарыфікацыя паказалі, што сярэднім арытмэтычным за адзін прапрацаваны дзень зьяўляецца сума **ў 1 р. 35 к.**

На 402 утрымаўцы калгас вызначыў па **58 руб.** на кожнага. Збожжам, крупамі, малочнымі і інш. прадуктамі калгаснікі **забясьпечваюцца ў дастатковай колькасьці** на наступнай норме: даросламу калгаснику выдаецца жыта 3,75 цэн., круп 0,8 цэн.; утрыманцу ад 15 да 18 год выдаецца 2,6 цэн. жыта і 0,5 цэн. круп; утрыманцу ад 12 да 14 год — жыта 2,33 цэн. і круп 0,4 цэнтн.; дзецям калгаснікаў да 12 год — жыта 1,8 кгр. [illegible] 0,2 цэн. Аксамя гэтага ўсе ком і інш. Усе калгаснікі забясьпечваюцца адразу-ж пасьля абмалоту да новага ўраджаю. Зусім відавочна, што паказаныя нормы поўнасьцю **скарыстаны ня будуць.** Застануцца пэўныя **лішкі.** Калгаснікі адпагалосна пастанавілі **ня вазьці на рынак лішкаў.** Лішкі пакідаюцца ў калгасе і за іх калгаснікі **атрымліваюць кампэнсацыю грашыма.** Уся натуральная частка прадукцыі пераводзіцца на грошы. Такім чынам, калгас здасьць дзяржаве прадуктаў сёлета на суму больш за **100.000 руб. Расьсьвет Пераможца» плаціць здаць дзяржаве адну трэцюю частку валавога ўраджаю збожжа.**

Што-ж даў калгаснікам калгас. Ураджай калгасных палёў у параўнаньні з індывідуальнымі серадняцкімі гаспадаркамі **вышэй у паўтары-два разы.** Прыбытак калгасніка **больш за прыбытак індывідуальніка-серадняка ў 3-4 разы.** Для прыкладу возьмем прыбытак, які павінен атрымаць бядняк **Станіславаў К. Р.** член калгасу «Расьсьвет Пераможца». Станіславаў мае сям'ю з 10 чал. (7працаздольных і 3 утрыманцы). Станіславаў павінен атрымаць 2.360 руб. 30 к. Гэта лічуваны прыбытак. Тав. Станіславаў кажа, што **гэтая лічба ў 10 разоў перавышае прыбытак, які ён атрымліваў працуючы на сваёй індывідуальнай гаспадарцы.** Харчаваньне будзе каштаваць Станіслававу прыкладна 1.160 руб. (малочныя прадукты, мяса, жыта, крупы і г. д. на год для ўсёй сям'і).

Рэшту — 1.200 руб. Станіславаў зможа скарыстаць на вопратку, паляпшэньне свайго добрабыту, проста кажучы, ён іх можа скарыстаць так, як захоча. Трэба ўлічваць, што ў паказаную суму прыбыткаў не ўваходзяць грошы, якія Станіславаў **павінен атрымаць у лік 5-процантнага адлічэньня.**

Трактарысты **Серэдоў Ц. Я.** — серадняк, у сям'і якога ёсьць толькі два працаздольныя, атрымае **каля 900 р.** Акрамя гэтага т. Серадаў **атрымае грошы ў лік 5-процантнага адлічэньня і прэмію за ўдарную работу ў веснавую пасеўную кампанію.**

Праўленьне калгасу зробіць справаздачу аб посьпехах калгасу па агульных сходах індывідуальнікаў Майскага сельсавету, на тэрыторыі якога знаходзіцца калгас.

Нельга абыйсьці моўчкі і посьпехаў калгасу «Расьсьвет Пераможца» ў стварэньні кармавой базы. Калгас першым у акрузе пабудаваў дзьве спрадвечным выганам. Гэты выган дасьць каля 1.000 цэнтн. добрага сена Амаль увесь папар (60 гэкт.) заняты пад засевам вікі.

Калгас **«Расьсьвет Пераможца»** прыняў выклік калгасу **«Ленінскі Шлях»** і ўключыўся ва ўсесаюзную перакліч ку на ўдарнае правядзеньне ўборкі ўраджаю. Калгаснікі на справе выконваюць свае абавязацельствы па ўдарнай уборцы ўраджаю. Яны паказваюць узор сапраўды баявых бальшавіцкіх тэмпаў работы. За 6 дзён калгас «Расьсьвет Пераможца» **ўбраў 50 проц. азімых і ячменю. Амаль скончана** ўборка сенажаці **«Расьсьвет Пераможца» сьмела можа служыць прыкладам ня толькі для калгасаў Барбуйшчыны, але і для калгасаў Беларусі.**

Брыгадзір **«ЗЬВЯЗДЫ»**
**САЛДАЦЕНКА.**



Перад выхадам у поле
На здымку: рамонт жнярэкі ў калгас «Расьсьвет Пераможца»

## НОВЫ ПРЫЛІЎ

### За 8 дзён у калгас імя Фрунзэ уступіла 25 гаспадарак

**Брыгады камунараў**

**ПОЛАЦАК, 23.** (БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»). БАЯВАЯ ПАДРЫХТОЎКА АСОБНЫХ КАЛГАСАЎ ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ І АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ВЫКЛІКАЕ НОВЫ ПРЫЛІЎ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК У КАЛГАСЫ. У КАЛГАС ІМЯ **ФРУНЗЭ З 12 ПА 20 ЛІПЕНЯ УСТУПІЛА 25 НОВЫХ ГАСПАДАРАК.** УСТУПІЛІ ПЕРАВАЖНА БЕДНЯКІ І РЭШТА — СЕРАДНЯКІ. УСЕ ІНДЫВІДУАЛЬНІКІ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ У КАЛГАС, АДНАДУШНА ПРЫНЯЛІ СТАТУТ С.-Г. АРЦЕЛІ.

УБОРКА ЎРАДЖАЮ Ў КАЛГАСЕ ІМЯ ФРУНЗЭ Ў ПОЎНЫМ РАЗГАРЫ. КАНЧАЕЦЦА ЎБОРКА АЗІМЫХ. ЗА КАЛГАСАМ ІМЯ ФРУНЗЭ Ў АВАНГАРДЗЕ ІДЗЕ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ КАМУНА ІМЯ **№-СКАЯ ДЫВІЗІІ.** КАМУНАРЫ СТВАРЫЛІ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ, ЯКІЯ ЗАКЛЮЧЫЛІ ПАМІЖ САБОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДАГАВАРЫ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ І ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ. НА ЧАС ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ Ў КАМУНЕ АРГАНІЗУЮЦЦА ПЕНА, ШТО Ў ТЭРЭНА ЗРАМАДЗЯЦЬ ЎБОРКУ ЎРАДЖАЮ І ЗАСЕЕ АЗІМЫ КЛІН.

НІКІЦІН.

## Насупроць кулацкай агітацыі

**(Ельскі раён, Мазыршчына)**

Ня гледзячы на шалёную кулацкую агітацыю члены калгасу **«Прыклад»** з посьпехам спраўляюцца з уборачнай кампаніяй. Калгас канчае ўборку сенажані і азімых. У калгасе **«Новае Жыцьцё»** калгаснікі абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньні ўборачнай кампаніі. Ударнікі з «Новага Жыцьця» па справе працуюць па ўдарнаму. У кароткі тэрмін калгаснікі склалі 8 коп сена і нажалі 65 коп жыта.

Р.

## Райком—у боку

**МАЗЫР, 23. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). У КАЛІНКАВІЦКІМ раёне пачалася касьба і ўборка азімых. Між тым, у сельсаветах і калгасах за адзінкавымі выключэньнямі НЯМА плянаў уборачнай кампаніі. Рамонт машын далёка НЯ СКОНЧАНЫ. У Дамаявіцкай трактарнай калёне, напрыклад, выбылі са строю тры трактары. Да сёняшняга дня яны яшчэ НЕ АДРАМАНТАВАНЫ.**

**Раённыя арганізацыі не распрацавалі ніякіх мерапрыемстваў па дапамозе індывідуальным бядняцкім гаспадаркам. Раённы камітэт партыі стаіць у баку ад уборачнай кампаніі. На палёх няма партыйна-камсамольскага актыву. Зараз у самыя гарачыя дні ўборкі РК КП(б)Б склікаў раённыя курсы па вывучэньні партыйных пастаноў. Хіба-ж нельга было склікаць гэтыя курсы пазьней?**

**Кулацтва ўсялякім спосабам імкнецца сарваць уборачную кампанію. Кулакі адкрыта выступаюць супроць калгаснікаў-кулакі не сустракаюць [illegible] пору.**

ТОЎСЬЦІК.

## Скарыстаць жнявярку

**МАЗЫР,** 23. (Наш кар.). Калгас **«Прагрэс»** (Лельчыцкі раён) падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Плян правядзеньня ўборачнай кампаніі складзены сваячасова. Калгаснікі разьмеркаваны на брыгадах. «Прагрэс» канчае пабудову гумна і прыступіў да ўборкі сенажаці.

Калгасу не хапае вазоў і збруі. Райпаляводсаюз нічога не зрабіў, каб, як належыць, забясьпечыць калгас. Жнявярка, якая ёсьць у калгасе, не скарыстоўваецца і валяецца бяз усякай карысьці пад навёсьцю. Калгаснікі ня ведаюць, як трэба абыходзіцца з гэтай машынай. Між тым, у раёне адчуваецца пястача ў жнявярках.

## АБ ЛІКВІДАЦЫІ АКРУГ

**Пастанова ЦВК і СНК БССР**

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці, шырока разгорнуты калгасны рух у вёсцы і ліквідацыя кулацтва, як класы, бяруць удзел шырокіх мас рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і сераднякоў у сацыялістычнай перабудове ўсяе народнае гаспадаркі патрабуюць ад усяго савецкага апарату, у першую чаргу, ад яго нізавых органаў, выразнага кіраўніцтва ажыцьцяўленьнем задач.

Для гэтага неабходна ўсялякае ўмацаваньне і максымальнае набліжэньне органаў улады да насельніцтва, пашырэньне праў і абавязкаў гэтых органаў і ўстанаўленьне непасрэдной сувязі іх з кіруючымі цэнтральнымі органамі ўлады, цэнтральнымі выканаўчымі камітэтамі і саветамі народных камісараў саюзных і аўтаномных рэспублік і краявымі (абласнымі) выканаўчымі камітэтамі. Набліжэньне органаў улады да насельніцтва будзе садзейнічаць спрашчэньню апарату ў рашучай барацьбе з бюракратызмам і яшчэ большаму ўцягненьню шырокіх рабочых і сялянскіх мас у практычную работу саветаў. Выходзячы з гэтага, ЦВК і СНК пастанаўляюць:

1. Скасаваць акругі, устанавіўшы канчатковым тэрмінам ліквідацыі акруговых органаў — 1 кастрычніка 1930 г.

2. Пры скасаваньні акруг выходзіць з існуючых граніц раёнаў і сельскіх саветаў, не дапускаючы іх узбуйненьня. На пэрыяд ліквідацыі акруг зьмена граніц раёнаў і сельсаветаў можа рабіцца ня інакш, як з дазволу прэзыдыуму ЦВК СССР.

3. У сувязі з ліквідацыяй акруг, перадаць іх матар'яльныя сродкі і культурныя сілы раённым выканаўчым камітэтам, стварыўшы з іх такім чынам моцныя і блізкія да насельніцтва органы ўлады на кіраўніцтве ўсім палітычным, гаспадарчым і сацыяльна-культурным жыцьцём раёнаў.

4. Запрапанаваць урадам саюзных і аўтаномных рэспублік, а таксама краявым (абласным) выканаўчым камітэтам узмацніць работу па кіраўніцтве нізавымі органамі ўлады і безадкладна ўстанавіць непасрэдную сувязь з раённымі выканаўчымі камітэтамі. У гэтых мэтах узмацніць інструктарска-інспэктарскі апарат цэнтральных выканаўчых камітэтаў саюзных і аўтаномных рэспублік і краявых выканаўчых камітэтаў.

5. Перадаць раённым выканаўчым камітэтам правы і ўскласьці на іх абавязкі, наданыя законадаўству акруговым выканаўчым камітэтам.

6. Замацаваць за раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі даходы, якія прадастаўлены паводле законадаўства акруговым выканаўчым камітэтам.

7. Перадаць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкіх саветаў усіх прадпрыемстваў і сацыяльна-культурных устаноў, якія знаходзяцца пад ведамам акруговых выканаўчых камітэтаў, за выключэньнем тых, якія на падставе асобных пастаноў павінны быць замацаваны за выканаўчымі камітэтамі і цэнтральнымі органамі саюзных рэспублік па прыналежнасьці.

8. У мэтах большага ўмацаваньня і пашырэньня матар'яльнай базы нізавых саветаў паскорыць увядзеньне самастойных бюджэтаў ва ўсіх сельскіх саветах Саюзу ССР.

9. Ня менш 90 проц. адказных работнікаў акруг накіраваць на работу ў раёны. Адначасова з гэтым ужыць рашучыя меры па ўзмацненьні кадрамі сельскіх саветаў і паляпшэньні матар'яльнага становішча працаўнікоў раёну і сельскіх саветаў.

10. Пры правядзеньні ліквідацыі акруг правы аўтаномных рэспублік і абласьцей захаваць у поўным аб'ёме. Сетка сельскіх саветаў і раёнаў нацыянальных меншасьцей павінна быць таксама захавана поўнасьцю.

11. Арганізацыя раённай сыстэмы на паказаных вышэй пачатках павінна быць праведзена такім чынам, каб адміністрацыйныя выдаткі па кіраўніцтве на 30-31 бюджэтны год, як па дзяржаўным, так і па мясцовым бюджэце не перавышалі сум, асыгнаваных на ўтрыманьне акруговых і раённых апаратаў у 1929-30 г.

12. Запрапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных і аўтаномных рэспублік і краявым (абласным) выканаўчым камітэтам безадкладна выпусьціць спэцыяльныя камісіі, на якія і ўскласьці распрацоўку ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з ажыцьцяўленьнем ліквідацыі акруг.

13. У сувязі з ліквідацыяй акруг і скасаваньнем акруговых бюджэтаў, запрапанаваць НКФ СССР у пяцідзённы тэрмін даць указаньні аб такім парадку складаньня каштарысных бюджэтаў, які забясьпечыў бы ўзмацненьне раённых бюджэтаў і правядзеньне іх у жыцьцё да 1 кастрычніка 1930 г.

14. Запрапанаваць Цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік у двухдзённы тэрмін прадставіць у прэзыдыум ЦВК даклад аб ужытых мерах па ліквідацыі акруг і ўмацаваньні работы раённых выканаўчых камітэтаў.

15. Даручыць СНК СССР распрацаваць праект палажэньня аб асновах арганізацыі раённых органаў улады і ў месячны тэрмін унесьці яго на разгляд прэзыдыуму ЦВК СССР.

Старшыня ЦВК СССР КАЛІНІН.
Старшыня Саўнаркому РЫКАЎ.
Сакратар ЦВК СССР ЕНУКІДЗЭ
23 ліпеня 1930 г.

## Урачыстае адкрыцьцё II сусьветнага зьлёту піянэраў у Бэрліне

**У ганаровы прэзыдыум абраны т.т. Сталін, Молатаў, Варашылаў, Тэльман, Косараў**

**Ангельская дэлегацыя арыштавана паліцыяй Макданальда**

БЭРЛІН. 24 ліпеня ў адной з буйнейшых аўдыторый Бэрліна ва ўсходнім рабочым раёне гораду адбылося ўрачыстае адкрыцьцё другога сусьветнага зьлёту юных піянэраў. Вялізарная заля была перапоўнена чужаземнымі і нямецкімі піянэрамі-дэлегатамі, а таксама масамі рабочых і дзяцей, якія прысутнічалі на адкрыцьці кангрэсу ў якасьці гасьцей. Капі ў залю ўвайшлі капёны забароненай маладой антыфашысцкай гвардыі і чырвонага «юнг-фронту», раздаўся грамавы воплеск «РОТ ФРОНТ».

Прадстаўнік КІМ'у ва ўступнай прамове зьвярнуўся з прывітаньнем да ўсіх піянэраў і, асабліва, піянэраў СССР, дэлегацыі якіх нямецкі ўрад і бэрлінскі с.-д. паліцэй - прэзыдэнт Цэргібель не дазволілі ўезд у Нямеччыну. Мінутным маўчаньнем і пяяньнем «Вы жертвою палі» кангрэс ушанаваў памяць усіх ахвяр крывавага фашысцкага тэрору і капіталістычных драпежніцтваў.

Пры гучных апладысмэнтах у ганаровы прэзыдыум кангрэсу выбіраюцца т.т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ, ТЭЛЬМАН і КОСАРАЎ.

### Паляваньне саксонскай паліцыі за піянэрскай дэлегацыяй

БЭРЛІН, 23. 12 прывітальных мітынгаў, арганізаваных бэрлінскімі піянэрамі і рабочымі ў гонар піянэрскіх дэлегацый, прыбыўшых на зьлёт, зьявіліся магутнай дэманстрацыяй міжнароднай салідарнасьці пралетарскіх дзяцей і рабочых. Нязвычайнае абурэньне выклікала на мітынгах паведамленьне аб тым, што саксонская паліцыя наладзіла піратарыя папяваньне за саксонскай піянэрскай дэлегацыяй. Ня гледзячы на забарону саксонскага міністра ўнутраных спраў, піянэрская дэлегацыя прабавала на грузавіках прабрацца ў Бэрлін. Паслання ў здагон паліцэйскія захапілі часьць дзяцей на шашы і прымусілі іх вярнуцца назад. Другой часьці піянэраў удалося прарвацца праз паліцэйскі кардон і цяпер яны знаходзяцца на шляху ў Бэрлін.

З штабу зьлёту паведамілі, што паводле чутак ангельская піянэрская дэлегацыя арыштавана паліцыяй Макданальда. Рабочыя, ня гледзячы на цяжкую галечу прадаставілі для начобак піянэраў значна больш кватэр, чым чакалі. (ТАСС).

### Піянэры кляўнуцца змагацца за дыктатуру пралетарыяту

БЭРЛІН, 23. З прычыны міжнароднага зьлёту юных піянэраў у Бэрліне адбылося 12 прывітальных мітынгаў, якім папярэджвалі дэманстрацыі піянэраў і рабочых пры ўдзеле атрадаў забароненай антыфашысцкай маладой гвардыі, чырвонага юнг-фронту і саюзу чырвоных франтавікоў. На мітынгах былі чутны рэзкія пратэсты супроць забароны ўезду ў Нямеччыну савецкай піянэрскай дэлегацыі. Выступаўшыя піянэры, у тым ліку і дзеці ад 8 да 12 г. пад шумныя апладысмэнты сабраўшыхся пакляліся разам з рабочай моладзьдзю змагацца за дыктатуру пралетарыяту. (ТАСС).

## Тав. Варашылаў у Гомелі

**ГОМЕЛЬ, 24. Сёньня раніцой у Гомель прыехаў наркамваенмор тав. ВАРАШЫЛАЎ. Працоўныя гораду вельмі радушна сустрэлі т. Варашылава.**

**Тав. Варашылаў сумесна з начальнікам БВА т. ЯГОРАВЫМ і мясцовымі работнікамі знаёміўся з станавішчам вайсковых часьцей і казарм.**

## Нямецкі друк аб зьменах у Наркамаце Замежных Спраў СССР

БЭРЛІН, 22. Нямецкая прэса аддае вялікую ўвагу новым назначэньням у Народным Камісарыяце замежных спраў. «Дойчэ Альгемайне Цэйтунг» заяўляе, што т. Крэсьцінскі ў час сваёй работы ў Бэрліне пільна сачыў за падтрыманьнем прыяцельскіх савецка-нямецкіх адносін. Газэты выказваюць надзею, што т. Крэсьцінскі будзе праводзіць гэтую палітычную лінію і на сваім новым пасту. (ТАСС).

***

БЭРЛІН, 22. Орган партыі цэнтру — «Німеччына», камэнтуючы зьмену ў Народным Камісарыяце Замежных спраў заяўляе, што цяперашняй палітыкай СССР афіцыйна будзе кіраваць чалавек, які давёў радам палітычных і дыпляматычных актаў у апошнія гады, што ён дасканала карыстаецца зброяй камунізму ў галіне замежнай палітыкі. Назначэньне Крэсьцінскага зьяўляецца пацьвярджэньнем таго факту, што СССР лічыць Бэрлін самым важным пунктам у замежнай палітыцы. (ТАСС).

## ВУЛІЧНЫЯ БАІ У КАІРЫ

**Суэц у руках паўстанцаў**

ЛЁНДАН, 22. Падзеі ў Эгіпце прынялі сур'ёзны характар. Дэманстрацыі ў Каіры, у Порт-Саідзе і Суэцы 21 ліпеня абярнуліся ў вулічныя баі, у час якіх было шмат ахвяр. Як падае Генэрсон у палаце абшчын, у працягу аднаго дня ў Эгіпце было забіта 19 чалавек і паранена 182, у тым ліку шмат паліцэйскіх.

У Каіры паліцыя некалькі раз адкрывала агонь па дэманстрантах. Паводле афіцыйных даных, забіта 4, паранена 89. На вуліцах — атрады паліцыі і вайсковыя часьці. Перакрыжаваньні вуліц ахоўваюцца бранявікамі. На даху парляманту і многіх устаноў устаноўлены кулямёты. Дэманстранты падпаліл

# Сьвінагадоўлю—на рэйкі ўдарніцтва

**Камсамолія Аршаншчыны выступіла ў паход за сьвінагадоўлю. Рашуча ўдарыць па цяганіне і нядбайнасьці**

## Разгарнуць работу па арганізацыі сьвінаводчых калгасаў

13 зьезд КП(б)Б з усёй рашучасьцю і зьвёрдасьцю падкрэсьліў, што праблема сьвінагадоўлі зьяўляецца асноўнай задачай разьвіцьця сельскае гаспадаркі БССР, і таму зьезд даручыў «усім партыйным і савецкім арганізацыям прыняць самыя рашучыя меры да ажыцьцяўленьня спэцыяльных плянаў разьвіцьця жывёлагадоўлі, прынятых ЦК КП(б)Б і Саўнаркомам БССР». Далей зьезд прапанаваў: «Усямерна праводзіць працу на пашырэньні жывёлы ў масавых бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарках, стымулюючы разьвіцьцё ў іх гэтае справы, асноўную ўвагу трэба сканцэнтраваць на пашырэньні стада жывёлы ў саўгасах і калгасах, асабліва ў спэцыялізаваных сьвінаводных і малочных гаспадарках».

Асабліва вялікую ролю ў справе найбольш хуткага вырашэньня мясной праблемы іграе сьвінагадоўля. У галіне сьвінагадоўлі на калгасы БССР ускладзена вельмі вялікая і адказная задача, якая заключаецца ў тым, што калгасы павінны паставіць 100 тысяч сьвінаматак, забясьпечыўшы выхад таварнай прадукцыі ў 1930—31 г. ў 500 тысяч сьвіней.

Для таго, каб выканаць гэту задачу, неабходна ўпартая і напружаная работа ўсіх зьвеньняў калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы па будаўніцтве сьвінаводных калгасаў і камплектаваньні іх сьвінямі. Згодна пастановы СНК БССР ад 21 чэрвеня г. г. па будаўніцтва сьвінаводных калгасаў вызначана 22.520 тыс. руб. З уласных сродкаў калгасаў — 9.940 тысяч руб. і з с.-г. крэдыту 12.670 тысяч руб. З намечаных па с. г. крэдыту 12.670 тысяч руб. ужо асыгнавана 5.860 тысяч руб., а астатнія 6.810 тысяч руб. будуць праведзены ў першым квартале 1930—31 году. Разам з гэтым да 1-га кастрычніка 1930 г. сьвінаводныя калгасы павінны паставіць ня менш як 48.000 сьвінаматак.

Ня гледзячы на тое, што работа па арганізацыі сьвінаводных калгасаў распачата яшчэ ў красавіку месяцы гэтага году, мы яшчэ і па сёнешні дзень ня маем належнага зруху і нават маецца пагроза зрыву намечаных мерапрыемстваў. Так, напрыклад, з вылучаных 135 сьвінаводных калгасаў, будаўніцтва сьвінарнікаў распачалі прыблізна 50 проц., а астатнія яшчэ толькі «рыхтуюцца». Надзвычайна дрэнна праходзіць кантрактацыі сьвіней. На 1 ліпеня сыстэмай Белмалжывсаюзу закантрактавана па ўсіх відах кантрактацыі толькі 23.6000 сьвіней і закуплена 163 сьвіні.

Яшчэ і да гэтага часу калгасна-каапэрацыйная сыстэма не зьвярнула належнай увагі на справу арганізацыі сьвінаводных калгасаў. Асабліва вялікая [illegible] задачы.

Надзвычайна дрэнна настаўлена маса вая работа. Вылучэньне сьвінаводных калгасаў часта праводзілася чыста адміністрацыйным парадкам, без належнай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў. У выніку такой работы, калгасьнікі не заўсёды ўяўляюць, якую вялікую ролю адыгрываюць правадзімыя мерапрыемствы па разьвіцьці сьвінагадоўлі і глядзячы на гэту задачу, як на другарадную.

Ёсьць і такія выпадкі, калі некаторыя працаўнікі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы займаюцца толькі агульнымі разважаньнямі наконт таго, як разгарнуць работу па арганізацыі сьвінаводных калгасаў, замест таго, каб найсьці непасрэдна ў калгасы, растлумачыць калгасьнікам важнасьць правадзімых мерапрыемстваў ў галіне сьвінагадоўлі і дапамагчы калгасам наладзіць і арганізаваць гэту справу.

**У камуне «Чайка» (Кіеўшчына) шпаркім тэмпам пашыраецца сьвінагадоўля. Зараз у камуне маецца 120 добрых ёркшырскіх сьвіней.**

**На здымку ёркшырская сьвіня камуны «Чайка».**

Бязумоўна вялікай перашкодай зьяўляецца недахоп будаўнічых матар'ялаў, асабліва дэфіцытных—цьвікоў, жалеза цэманту і г. д. Аднак недахоп гэтых матар'ялаў ня можа служыць перашкодай для разгортаньня будаўніцтва сьвінаводных калгасаў, бо мы маем магчымасьць замены дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў мясцовымі. Трэба адзначыць што ў гэтай галіне інжынэрна-тэхнічны пэрсанал не праявіў патрэбнай гібкасьці, каб спросьціць будаўніцтва і ў максымальнай ступені скарыстаць мясцовыя будаўнічыя матар'ялы. Наадварот, мы маем такія выпадкі, калі паасобныя тэхнікі адмаўляліся распачынаць будаўніцтва таму, што трэба было трохі зьмяніць тыпавы праект, або поўнасьцю нехапала ўсіх матар'ялаў. У той-жа час мы маем не аднаразовыя выпадкі безгаспадарчага выдаткаваньня цэманту, цэглы і іншых будаўнічых матар'ялаў.

Пры вострым недахопе спэцыялістых па сьвінагадоўлі яшчэ і да сёнешняга дня частка спэцыялістых замест таго, каб займацца жывой справай у калгасах, сядзіць у канцылярыях і займаецца [illegible] не адчуваецца баявы тэмпаў у работе вэтэрынарыі, у выпадку чаго у многіх мясцох гінулі сьвіньні.

Усе гэтыя недахопы, у тым выпадку калі яны ня будуць своячасова зьнішчаны, награжаюць зрывам арганізацыі сьвінаводных калгасаў. Таму неабходна па працягу бліжэйшых дзён дабіцца рашучага пералому ў галіне будаўніцтва і камплектаваньня сьвінаводных калгасаў. Трэба, каб акруговыя і раённыя партыйныя, савецкія і каапэрацыйныя арганізацыі і ўстановы ў тэрміновым парадку праверылі як ідзе выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР у галіне сьвінагадоўлі і радам рашучых і тэрміновых мерапрыемстваў забясьпечылі сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў гэтай рабоце. Асабліва вялікую ўвагу трэба зьвярнуць на масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў. Неабходна справу паставіць так, каб кожны калгасьнік добра ўявіў значэньне праводзімых мерапрыемстваў і сьвядома ўдзельнічаў у іх вырашэньні. Мэтад сацыялістычнага спаборніцтва паміж саўгасамі і калгасамі, а таксама паміж асобнымі калгасьнікамі павінен стаць асноўным сродкам у будаўніцтве сьвінаводных калгасаў. Трэба ўзьняць творчы энтузіязм і энэргію калгасьнікаў, усямерна скарыстоўваючы іх вопыт і ініцыятыву. Работу кожнага сьвінаводнага калгасу ў паасобку неабходна паставіць пад сталы грамадзкі кантроль, усямерна дапамагаючы калгасам цалкам выканаць намечаны плян будаўніцтва.

Для таго, каб сапраўды дапамагчы калгасам у арганізацыі сьвінаводных гаспадарак, неабходна а мабілізаваных спэцыялістых для правядзеньня ўборачнай асеньняй пасеўной кампаніі вылучыць адпаведную колькасьць людзей і накіраваць іх у раёны, выключна для работы ў сьвінаводных калгасах.

Адначасова неабходна патрабаваць ад Наркампрацы, безадкладнага выкананьня пастановы СНК БССР аб перадачы сыстэме малочна-жывёлаводчай каапэрацыі на сталую работу ўсіх зоатэхнікаў, якія зараз сядзяць па розных канцылярыях.

Асабліва вялікую ўвагу трэба зьвярнуць на ўсямернае спрашчэньне будаўніцтва і максымальнае скарыстаньне мясцовых будаўнічых матар'ялаў, замяняючы імі дэфіцытныя будаўнічыя матар'ялы. Трэба вышэй забясьпечыць месцы належнай тэхнічнай дапамогай і кансультацыяй у гэтых адносінах. Трэба сьмялей ісьці па шляху спрашчэньня будаўніцтва і ўсямернага скарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў. Усе праявы безгаспадарчасьці і неэканамічнага выдаткаваньня будаўнічых матар'ялаў, трэба зьнішчаць усімі сродкамі.

Неабходна таксама як мага шырэй скарыстаць будынкі, якія маюцца ў калгасах для абсталяваньня іх пад сьвінарнікі.

Адначасова неабходна дзяржпляну сапраўды выканаць пастанову СНК БССР ад 21 чэрвеня гэтага году аб забясьпячэньня будаўнічымі матар'ялямі разьвіцьцё жывёлагадоўлі ў першую чаргу пасьля прамысловасьці. Неабходна, рашуча зьнішчаючы недахопы ў галіне арганізацыі сьвінаводных калгасаў, сканцэнтраваць вагы і шырокі ўдзел рабочае класы, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства ў вырашэньні гэтай важнейшай задачы.

Юр. СТРЭЛЕ.

У паход за паперу

# ЛІКВІДАВАЦЬ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ РАЕНАУ БССР

**Мабілізаваць увагу ўсяе грамадзкасьці на збор каштоўнага сырцу, які валяецца на сьметніках**

## Каштоўны сырэц —на сьметніках

Кожны з нас добра ведае, якое значэньне мае папяровая макулятура і аса бліва ў сучасны момант, калі ў нас адчуваецца востры крызіс у папяровай прамысловасьці.

Здавалася, нашы ўстановы і арганізацыі, зразумеўшы гэта, прымуць усе належныя захады да сыстэматычнага збору папяровае макулятуры, якой ва ўстановах ёсьць даволі многа.

Тыя факты, якія мы маем у нашым распараджэньні, гавораць за тое, што шмат якія арганізацыі і ўстановы сваімі адносінамі ігнаруюць гэту справу.

Кучы паперы валяюцца пад сталамі ў Народным Камісарыяце Зямляробства, якую раніцою тэхработніца спакойна выкідае на сьметнік.

Такое самае становішча і ў Наркамасьветы, дае нават зусім і ня думалі аб зборы макулятуры, бо гэта «дробная» справа.

Беджылсаюз нас запэўніў па пасяджэньні штабу ў тым, што «мы зрабілі ўсё магчымае». А паглядзеце-ж, што «магчымага» зрабіў Белжылсаюз. Ён прапанаваў ЖАКТ'ам, каб тыя зьбіралі макулятуру і ўтыльсыравіну. І гэта—ўсё ЖАКТ'ы, атрымаўшыя гэтыя паперкі падшылі іх да справы, а збор паперы нават не распачалі.

ЦРК выходзіць на гэтым фронце «пераможцам», бо ніхто іншы, як ён так бязьлітасна раскідвае карашкі і пакавальную паперу.

— Папяровыя адкіды—дробязь, гэтага дабра ў нас хопіць,—вось дэвіз работнікаў МЦРК.

Фактаў злачынных адносін да папяровай макулятуры можна прывесьці яшчэ больш, але досыць і гэтых, каб па казаць кіраўніком установ і арганізацый, што ўсё тое, што можна была зрабіць, яшчэ ня зроблена.

Усю паперу, якую тонамі штодзёна выкідваюць на сьметнікі, можна было-б сабраць і здаць у «Белутыль».

Трэба адзначыць з усёй рашучасьцю, што вакол гэтых пытаньняў **не завострана ўвага грамадзкасьці.**

Камсамол і іншыя грамадзкія арганізацыі, якія павінны былі ў першую чаргу прымаць актыўны ўдзел у зборы і ў зьберажэньні папяровай макулятуры і ўтыльсыравіны, у гэтай кампаніі яшчэ нічога практычнага дагэтуль не зрабілі.

Злачынным адносінам да папяровай макулятуры павінен быць пакладзен канец.

Л.

## Да ўсіх дырэктароў прадпрыемстваў, фабзаўмясцкомаў, загадчыкаў архівамі, бібліятэкамі, установамі, магазынамі, да ўсіх рабочых і служачых Беларусі

Сход рабкораў г. Менску зварачаецца да вас з просьбай прыняць актыўны ўдзел у «паходзе за паперу». Праглядзеце ўсе вашы архівы (карашкі накладных, старыя непатрэбныя газэты, кнігі, брашуры), адзялеце ад усяго патрэбнага ў вашай рабоце НЕПАТРЭБНАЕ і здайце ў Белутыльсыравіну (Менск, Ленінская, тэл. 10-61) для папяровай прамысловасьці. Прасачэце, як выдаткоўваецца патрэбная для краю паперы, увядзеце ва ўстановах і канторах спаборніцтва за эканомію паперы. Кавалкамі паперы мы з'эканомім тоны патрэбнай для культурнай рэвалюцыі паперы.

Падумайце аб праблеме культурнай пяцігодкі і неадкладна прыступайце да працы.

Аб усіх прынятых мерапрыемствах паведамляйце ў Беларускі штаб агляду (Менск, рэд. «Зьвязда», тэл. 6-19).

БЕЛАРУСКІ ШТАБ.
СХОД РАБКОРАЎ г. МЕНСКУ.

УВАГА: Ва ўсіх іншых гарадох і мясцох БССР здавайце ў аддзяленьні Белдзяржгандлю і Белкаапсаюзу.

## У раёнах яшчэ няма зруху

Беларускі штаб яшчэ некалькі дзён таму назад зьвярнуўся да ўсіх акруговых газэт з просьбай стварыць пры газэтах штабы агляду спаборніцтва пад лёзунгам «у паход за паперу», з мэтаю шырокага асьвятленьня на старонках газэт задач гэтае кампаніі, мабілізацыі ўвагі рабочых мас і давядзеньня гэтае кампаніі да кожнага прадпрыемства, да кожнае установы.

Аднак, Беларускі штаб канстатуе недапушчальную бядбайнасьць акруговых газэт да гэтае кампаніі. Дагэтуль яшчэ ні адна газэта не пачала кампаніі. Няма ніякіх вестак аб стварэньні штабаў. Яшчэ не мабілізавана ўвага грамадзкасьці.

Характэрным зьяўляецца тое, што акруговыя газэты Гомелю, Віцебску, Магілеву і Бабруйску, дзе ёсьць прадпрыемствы па вырабе паперы, нічога ня робяць.

Улічваючы ўсё гэта, Беларускі штаб яшчэ раз зварочваецца да ўсіх акруговых газэт з просьбай безадкладна прыступіць да стварэньня штабаў па арганізацыі на ўсіх прадпрыемствах і установах ячэек зьберажэньня паперы і брыгад на аглядзе спаборніцтва паходу за паперу. Трэба шырока асьвятліць на старонках газэт задачы і мэты гэтай кампаніі. Трэба праводзіць масавыя сходы рабочых, рабкораў і работнікаў савецкіх установ па пытаньні аб эканоміі паперы і збору папяровай макулятуры і ўтылю.

Прымаючы пад увагу, што рабкоры Менску выклікалі як спаборніцтва рабкораў Гомеля, перад апошнімі стаіць баявая задача недкладна шырока разгарнуць работу ў рэдкалегіях фабрычна-заводзкіх і насьценных газэт, шляхам спаборніцтва паміж сабой, пад лёзунгам «усе на дапамогу рабочым папяровай прамысловасьці».

Трэба дабіцца, каб у акругах БССР кампанія агляду спаборніцтва ў экаманьні за паперу была пасунута наперад.

ЦУДЗІН.

# Ліквідацыю акруг правесьці плянава, ударнымі тэмпамі

**Праведзеньне ліквідацыі ні ў якой меры не павінна паслабіць выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній**

## Скончыць ліквідацыю акруг да 1 кастрычніка

**(Гутарка з Намесьнікам Старшыні ЦВК БССР тав. І. ХАЧКЕВІЧАМ)**

Сучасная наша адміністрацыйная структура—зазначае т. Хацкевіч—не адпавядае ўжо тым запатрабаваньням і тым задачам, якія сёньня ставіць перад намі жыцьцё. Будуючы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі сацыялізм і ідучы на шляху яго поўнага ажыцьцяўленьня ў нашай Савецкай краіне, мы за мінулы ўжо час дасягнулі вялікіх посьпехаў.

Мы праводзім сацыялістычную рэканструкцыю ўсёй народнай гаспадаркі, шляхам індустрыялізацыі краіны і шырокай калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ліквідуючы пры гэтым, на базе суцэльнай калектывізацыі,—кулацтва, як клясу.

Сацыялістычная перабудова народнай гаспадаркі ажыцьцяўляецца, дзякуючы актыўнаму ўдзелу ў гэтай перабудове шырокіх мас рабочых, батрацтва, бядняцка-сераднякцкага сялянства, дзякуючы імкненьням працоўнага сялянства да калектывізацыі. Усе гэтыя акалічнасьці і ўмовы нашага сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць, каб савецкі апарат, асабліва-ж яго нізавыя органы, былі належным чынам узмоцнены і падрыхтаваны да кіраўніцтва калгасным рухам і да ажыцьцяўленьня ўсіх тых новых задач, якія зьвязаны з разгорнутым сацыялістычным наступленьнем на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, і сацыялістычнай перабудовай нашай эканомікі, культуры і быту.

Першым запатрабаваньнем да савецкага апарату, у выніку палітычных і гаспадарчых умоў і задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца набліжэньне органаў улады да насельніцтва; узмацненьне і паляпшэньне работы ўсіх органаў і ў першую чаргу раённых выканаўчых камітэтаў. Гэтае неабходнае набліжэньне органаў улады да насельніцтва і вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць: узмацненьня матар'яльнай базы райвыканкомаў і саветаў, пашырэньня іх правоў і абавязкаў, а таксама непасрэдная сувязі іх з цэнтральнымі і рэспубліканскімі органамі ўлады.

Набліжэньне органаў улады да насельніцтва павінна таксама садзейнічаць спрашчэньню апарату, рашучай барацьбе з бюракратызмам і яшчэ большаму ўцягненьню шырокіх рабочых, батрацкіх і бядняцка-сераднякцкіх сялянскіх мас у практычную работу саветаў.

Вось у кароткіх рысах тыя прычыны і мэты, якія партыя і савецкая ўлада маюць на ўвазе, ліквідуючы акругу, як пасрэднае зьвяно ў нашай адміністрацыйнай структуры.

За кошт работнікаў акруг, у колькасьці ня менш, як 90 процантаў, будуць значна ўзмоцнены колькасна і якасна апараты раёнаў. Трэба пры гэтым зазначыць, што паляпшаючы наш савецкі апарат з усіх бакоў, шляхам ліквідацыі акруг, мы павінны дабіцца, каб выдаткі на ўтрыманьне апарату ні ў якім разе не перавышалі тыя сродкі, якія мы выдаем зараз пры існаваньні акруг па дзяржаўным і мясцовым бюджэце, на ўтрыманьне ўсяго апарату рэспублікі.

Ліквідацыя акруг будзе мець дадатныя вынікі і ў працы гарадзкіх саветаў. Пры існаваньні акруг гарсаветы, асабліва акруговых гарадоў, у большай часьць былі на становішчы пейкага падпанечнага органу, нават пры найлепшым жаданьні АВК даць гарсавету поўную самастойнасьць. Гэта зразумела не магло спрыяць рабоце нашых гарсаветаў.

Мы бачым, такім чынам, [illegible] тав. Хацкевіч, у канцы [illegible] часьці —што ліквідацыя акруг, [illegible] кал спрыяючым фактарам у [illegible] і шага ажыцьцяўленьня ты[illegible] якія зараз стаяць перад н[illegible]

Прэзыдыум ЦВК БССР [illegible] Ўрадавую Камісію пад старш[illegible] тав. КАЛІНІНА, якой даручана працаваць усе неабходныя мерапрыемствы па ліквідацыі акруг і ўзмацненьні нізавога апарату, з тым, каб уся работа ў сувязі з ліквідацыяй акруг была скончана да новага бюджэтнага гаспадарчага году—1-га Кастрычніка б. г.

У справу ліквідацыі акруг і вырашэньня пытаньняў, зьвязаных з гэтай ліквідацыяй, (узмацненьне нізавых савецкіх органаў, паляпшэньне іх матар'яльнай базы, пашырэньне правоў і абавязкаў, перадача маёмасьці і г. д.), павінны быць уцягнуты самыя шырокія працоўныя масы і ўся наша савецкая грамадзкасьць.

Вельмі пажадана, каб наш друк надаў пытаньню ліквідацыі акруг і рэканструкцыі, у зьвязку з гэтым, савецка-грамадзкага апарату—баявое значэньне.

## ВІЦЕБШЧЫНА РЫХТУЕЦЦА

Віцебскі акругком КП(б)Б вызначыў рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ліквідацыі акругі. Вылучана для гэтага некалькі падрыхтоўчых камісій: камісія па арганізацыйных пытаньнях, па пытаньнях аб кадрах і ўзмацненьні раёнаў; пры акрвыканкоме, акрпрафбюро, каапэрацыйных органах і г. д. вылучаюцца асобныя камісіі. Падрабязныя прапановы камісіі павінны даць не пазьней 1-га жніўня 1930 г.

На 21 ліпеня пры акругкоме КП(б)Б склікаецца нарада сакратароў райкомаў, старшынь райвыканкомаў і прапаўнікоў акруговых арганізацый па пытаньнях ліквідацыі акругі.

У сваёй пастанове Віцебскі акругком КП(б)Б рашуча папярэдзіў усе акруговыя і раённыя арганізацыі аб тым, што **ўсе мерапрыемствы па ліквідацыі акруговай сыстэмы ні пад якім відам і ні ў якай меры не павінны паслабіць увагі іх да своячасовага і поўнага правядзеньня важнейшых палітычных кампаній** (уборачная кампанія, падрыхтоўка да асеньняй сяўбы, хлебазагатоўчая кампанія і г. д.). На фракцыі і асабіста на кіраўнікоў тых ці іншых установ і арганізацый ускладзена адказнасьць за нармальны і бесьперабойны ход гэтых кампаній.

### Стварэньне камісіі ЦВК БССР па ліквідацыі акруг

Для падрыхтоўкі мерапрыемстваў па ліквідацыі акруг у БССР, прэзыдыум ЦВК БССР арганізаваў Урадавую Камісію ў складзе т.т. **Калініна (старшыня), Іванова, Хацкевіча, Гантмана, Рыжова, Рачыцкага, Гольдбэрга, Аксючыца, Гіляевіча, Буніна, Хаскіна, Рынзіна.**

*Пазыка „Пяцігодку за 4 гады"*

# Шырока разгорнутым сацыялістычным спаборніцтвам

## Забясьпечым пасьпяховую рэалізацыю пазыкі

### *Выклік вылучэнцаў Белкаапсаюзу*

15 рабочых-вылучэнцаў, якія працуюць у апараце Белкаапсаюзу, з мэтай дамагчы разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва, падпісаліся на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады» на суму 2.278 руб., што складае 98 проц. месячнай заработнай платы. Вылучэнцы Белкаапсаюзу выклікаюць вылучэнцаў іншых савецкіх установ і ўсіх супрацоўнікаў Белкаапсаюзу пасьледаваць іх прыкладу.

### *На 12 тысяч руб.*

**У Самарскай кав. дывізіі шырока разгарнулася падпіска на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады». На сёнешні дзень сума рэалізаваных аблігацый перавышае 12 тыс. руб. На першым месцы ідзе Самарскі кав. полк, які даў па папярэдняй падпісцы 4 тыс. руб.**

А. ГРЫШАНАЎ

### *Тэмпы, якія не гарантуюць посьпеху*

ГОМЕЛЬ (Наш кар.). Паводле заданьня, у Гомельскай акрузе павінна быць рэалізавана аблігацый новай пазыкі на суму 2.326.000 руб., з якіх на вясковы сэктар прыпадае звыш 330.000 руб.

Зразумела, што для выкананьня гэтага заданьня патрэбна добрая падрыхтоўка з боку акрфінаддзелу і камісій садзейнасьці. Але камісіі садзейнасьці нічога ня робяць.

Акрфінаддзел склікаў некалькі нарад камісій, але на нарады зьявілася вельмі мала прадстаўнікоў.

Прафарганізацыі слаба дапамагаюць папуляризацыі пазыкі.

Л. Л.

### *Як ідзе падпіска на заводах г. Менску*

**Паводле апошніх даных, з 560 рабочых ЗАВОДУ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» падпісалася 380 чал., або 68 проц. на суму капіт 16 тыс. руб. пры сярэднім месячным заработку ўсяго заводу ў 40 тыс. руб. Цалкам падпісаліся рабочыя сушні і транспарту.**

**Па ўсіх цэхах заводу пачало разгортвацца сацыялістычнае спаборніцтва на падпіску.**

**На ГАЛЯНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ «БЕЛАРУСКА» з 373 рабочых падпісалася 226 чал. на суму 6.200 руб. пры фондзе зарплаты за два тыдні 12.500 р.**

**Падпіска складае 65,5 проц. заданьня.**

**У гузікавым цэху падпіска складае 113,4 проц. двухтыднёвай зарплаты. У мэханічнай майстарні падпіска дасягнула 750 руб. пры зарплаце 758 руб. Служачыя падпісаліся на 109 проц. двухтыднёвага заработку. Адстаюць грэбнёвы і палатняны цэхі.**

**На ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» лепш за ўсё праходзіць падпіска ў кавальным і бляшаным цэхах, дзе падпісалася 235 чал. на суму 11.000 руб. пры месячным фондзе зарплаты ў 22,5 тыс. руб. Адстаюць сьпесарны і такарны цэхі. Амаль што не закранутыя падпіскай чорнарабочыя заводу і сэзонныкі, якія працуюць на пабудовах і прымацаваны да заводу «Камунар».**

### *Першыя вынікі*

**Попярэдняя падпіска на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады» сярод рабочых менскіх цагэлень праходзіць з вялікім посьпехам.**

**На цагэльных №№ 1, 3, 8 і чатырох новых пабудовах падпіска толькі пачалася і ўжо дасягнула 6.350 р.—65% фонду зарплаты.**

**На першым месцы ідзе завод № 8, дзе рабочыя падпісаліся на 72% проц. заработнай платы.**

### Больш увагі рэалізацыі пазыкі сярод сэзонных

Скончылася кампанія рэалізацыі 2-ай і 3-яй пазыкі сярод сэзонных і часовых рабочых па Менскай акрузе. Вынікі кампаніі гавораць аб тым, што на мясцох не зьвярнулі на яе, як сьлед, увагі, правялі на «авось», спадзяваліся на самацёк. І ў выніку, падпіска сярод сэзонныкаў складае 14,5 тыс. руб. або 5,5 проц. кантрольнай лічбы.

При правядзеньні кампаніі быў дапушчаны рад парушэньняў дырэктыў. Замест таго, каб падпісную суму растэрміноўваць на ўвесь час работы і рэгулярна атрымоўваць чарговыя ўносы, нізавыя камісіі і рабочкомы ўтрымлівалі грошы па падпісцы ў два-тры разы, што, зразумела прывяло да таго, што падпісчыкі пачалі адмаўляцца ад значнай часткі аблігацый.

У зьвязку з тым, што кампанія па захоце сэзонныкаў другой і трэцяй пазыкай фактычна праваленa, і большасьць сэзонныкаў засталася неахопленай. Наркамфін прапанаваў зараз-жа правесьці сярод сэзонныкаў рэалізацыю пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады». Калі падпісчык-сэзонны ўнёс апошні ўнос па падпісцы на другую пазыку, дык яму пры абмене трэба выдаваць на рукі аблігацыі новай пазыкі. Аплочаныя аблігацыі 3-й пазыкі выдаюцца падпісчыкам на рукі, таксама, як аблігацыі другой пазыкі, калі ў момант выдачы іх падпісчыкам не праводзіўся абмен на аблігацыі новай пазыкі. Кампанія рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» праводзіцца сярод сэзонныкаў пад лёзунгам «100-процантны захоп двухтыднёвага заработку ўсіх рабочых».

Камісіі садзейнасьці на пабудовах павінны правесьці шырокую растлумачальную работу сярод сэзонных рабочых, дабіцца дадатковай падпіскі да двухтыднёвага заработку, калі сэзоннік падпісаўся на 2-ю і 3-ю пазыку на суму значна меншую, чым двухтыднёвы заработак. Зразумела, гэта работа павінна праходзіць пад знакам поўнай добраахвотнасьці падпіскі.

Інспэктар.

### „Сьпяшацца няма куды"

**САМПРАМКРЭДЫТ ЧАКАЕ НАДВОР'Я**

Таварыства саматужна-прамысловага крэдыту—адзін з контр-агэнтаў па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—у чатыры гады» у Менску. Яго задача—ахапіць кампаніяй каля 60 саматужных арцеляў гораду, за выключэньнем саматужнікаў-адзіночак.

Сампрамкрэдыт замест таго, каб правесьці баявую работу сярод саматужнікаў, каб пачаць падпісную кампанію, чакае, пакуль саматужнікі самі да яго прыдуць. Дагэтуль нічога ня зроблена—сходы не праведзены, падпіска не пачата.

Ніякай работы па новай пазыцы ня відаць. Калі ня відаць новай работы, дык затое вынікі старой б'юць проста ў вочы: па сёнешні дзень за сампрамкрэдытам лічыцца заназначанасьць па ўзносах па 3-ай пазыцы на суму 33.000 руб.

Трэба запытаць у паважанага контр-агэнта, ці абмяжуецца ён толькі тым, што будзе трымаць над сукном кантрольныя лічбы і насіць годнасьць контр-агэнта.

Бірштэйн.

ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ
ПА 3-Й ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ
АДБУДЗЕЦЦА
Ў МЕНСКУ
1-га, 2-га і 3-га ЖНІЎНЯ.
БУДЗЕ РАЗЫГРАНА ВЫЙГРЫШАЎ НА
18.527.600 РУБЛЁЎ.
УСЕ ПРАЦОЎНЫЯ—НА ТЫРАЖ!

# Трывожныя сыгналы з Магілеўшчыны

**ЧАСТКА КАЛГАСАЎ АДМЎЛЯЕЦЦА БУДАВАЦЬ СЬВІНАРНІКІ**

На Магілеўшчыне, за выключэньнем Шклоўскага раёну, да гэтага часу мы ня маем баявых тэмпаў у арганізацыі сьвінаводных гаспадарак і будаўніцтве іх. На сёнешні дзень сярод калгасьнікаў яшчэ не праведзена растлумачальная работа аб значэньні будаўніцтва сьвінарнікаў, не мабілізавана іх думка вакол гэтага важнага пытаньня. Такое становішча мы маем, напрыклад, у Чачэвіцкім раёне, Чавускім і інш.

Калі ў Шклоўскім раёне будаўніцтва сьвінарнікаў разгортваецца пасьпяхова (усе 7 гаспадарак прыступілі да будаўніцтва і ў шмат якіх гаспадарках яно хутка будзе скончана), дык зусім процілеглае становішча мы маем у іншых раёнах.

Так, Чавускі раён зусім яшчэ не прыступаў да будаўніцтва і нават не загатовіў будаўнічых матар'ялаў. А вызначана пабудаваць у раёне 8 сьвінаматачнікаў. У Бяльніцкім раёне з вызначаных 8 сьвінаматачнікаў будуецца толькі і адзін, у Касьцюковіцкім раёне з 12 матачнікаў будуецца 3, у Крычаўскім з 13—3, у Быхаўскім з 10—4, у Лупалаўскім—13—7, у Клімавіцкім з 20—9.

Усяго паводле вестак акрмалжывсаюзу будуецца толькі 45 сьвінаматачнікаў, замест 123-х.

Некаторыя калгасы зараз і зусім адмаўляюцца ад арганізацыі сьвінаводных гаспадарак і будаўніцтва ў іх матачнікаў (калгас імя Карла Маркса, Чачэвіцкага раёну і ў Крычаўшчыне).

У Чачэвіцкім раёне камуна імя Фрунзэ на пабудову сьвінарнікаў атрымала 2.000 руб., але яна гэтыя сродкі скарыстала на будаўніцтва жылых памяшканьняў.

А. Сяньківіч.

# Злачынныя адносіны да адкорму

**(Калінкавіцкі раён, Мазырскай акругі)**

У саўгасе Ліпава па сьвінапункце адкармліваюць сьвіней травою, з тае прычыны, што саўгасу Белсельтрэст і Саюзхлеб не даваляюць выкарыстоўваць іншыя карма.

У выніку пры здачы першай партыі сьвіней пасьля 3½ месяцаў адкорму з 16 шт. прызнаны толькі 10 шт. сальнымі, 5 шт. — напалову сальнымі і 1—худою.

Такія адносіны да адкорму сьвіней фактычна зрываюць сьвінагадоўлю, якой як вядома, зараз надаецца такая вялікая вага ў нашым гаспадарчым жыцьці.

Брыгадзір «Зьвязды» Тоўсьцін.

# Чаму арганізуецца Беларускі мэдычны інстытут

Пастановай СНК БССР мэдфак БДУ разгортваецца ў самастойны інстытут, выдзяляецца са складу ўнівэрсытэту і перадаецца у ведамы НКАховы Здароўя. Увесь працэс рэарганізацыі павінен быць закончан да 1-га жніўня г. г.

Прычыны, якія выклікаюць арганізацыю самастойнага мэдыцынскага інстытуту, наступныя:

Разьвіцьцё і спэцыялізацыя савецкай аховы здароўя, якая павінна абслугоўваць горад і вёскі, патрабуе карэннага перагляду і мэтавай установкі мэдычнай асьветы. Доктар павінен канчаць вышэйшую школу вузкім спэцыялістам або ў галіне санітарна-гігіенічнай або лячэбна-прафілактычнай.

Выкладаньне ў вышэйшай мэдычнай школе трэба пабудаваць так, каб ужо ў ёй студант мог набыць усе тыя веды і навыкі, якія яму будуць патрэбны ў яго далейшай рабоце ў якасьці вузкага спэцыялістага. Галоўнейшай прадпасылкай гэтаму зьяўляецца грунтоўная пастаноўка тэарытычных прадметаў, якія павінны служыць фундамантам для далейшай практычнай работы доктара. Затое спэцыяльныя прадметы могуць у значнай ступені быць прыстасаваны да тэй будучай вузкай спэцыяльнасьці, у якой будзе працаваць доктар. Адсюль мы бачым, што мэдычную асьвету трэба падзяліць на цэлы рад асобных галін. Для кожнай з іх трэба стварыць асобны факультэт. У межах кожнага факультэту трэба будзе арганізаваць яшчэ і аддзяленьні. Відавочна, што такая складаная структура ніяким чынам не ўкладваецца ў межах факультэту, які зьяўляецца часткай унівэрсытэту. Гэта магчыма толькі ў спэцыяльным інстытуце.

Спачатку маецца на ўвазе разгарнуць ў ін-це два факультэты: санітарна-гігіенічны і лячэбна-прафілактычны. На апошнім будуць аддзяленьні стоматалагічнае, аховы матарынства і дзіцяці, аддзяленьне аховы здароўя дзяцей і тэрапэўтычна-хірургічнае. Магчыма і далейшы падзел санітарна-гігіенічнага факультэту на аддзяленьні: камунальнай санітарыі, харчовай санітарыі, прамысловай санітарыі, эпідэміолёгіі і г. д.

У далейшым можна будзе разгарнуць некаторыя аддзяленьні лячэбна-прафілактычнага факультэту ў самастойныя факультэты.

Новыя мэтады выкладаньня патрабуюць максымальнага ўжываньня у праграме вытворчага практыкуму. Прыблізна палавіну ўсяго навучальнага часу студэнты павінны праводзіць на выробчасьці. Для правільнага і бесперабойнага выкарыстаньня ўсіх устаноў НКАховы Здароўя патрэбна асабліва цесная ўвязка інстытуту з усім апаратам НКАховы Здароўя зьверху і ніжэй. Вось чаму патрэбна, каб мэдычны інстытут стаў установаю НКАховы Здароўя.

Пры распрацоўцы праграм асобных прадметаў і ў кіраўніцтве ўсёй справай палрыхтоўкі маладых дактароў павінен быць забясьпечан сапраўдны ўдзел НКАховы Здароўя, на якога павінна быць ускладзена адказнасьць за тую прадукцыю, якую дасьць мэдычны факультэт.

Прафэсар М. Кроль.

# Камсамольскі паход за сьвінагадоўлю

Аршаншчына сёлета мае значнае плянавае заданьне ў галіне разьвіцьця сьвінагадоўлі. Паводле пляну павінна быць арганізавана да канца году 69 сьвінагадоўчых гаспадарак. У іх трэба пабудаваць 74 мат

*Пачынаем праверку рабочага забесьпячэньня*

# Рахунак спажыўца каапэрацыйным і загатоўчым арганізацыям

**Праверка рабочага забесьпячэньня, пачатая ЦКК РСІ разам з рэдакцыямі газэт рабочымі арганізацыямі, з першых-жа крокаў выявіла рад агіднейшых фактаў гапавацяпства і ігнараваньня выразных дырэктыў партыі аб рабочым забесьпячэньні.**

**Спажывецкая каапэрацыя БССР яшчэ не павярнулася тварам да спажыўца. Перабоі ў забесьпячэньні спажыўца гароднінай і інш. недэфіцытнымі прадуктамі сьведчаць, што спажывецкая і садова-агародная каапэрацыя, а таксама рэгулюючыя арганізацыі яшчэ не перабудавалі сваёй работы так, каб яна адпавядала сучасным тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва.**

**Бязьдзейнасьць і непаваротлівасьць Белрыбы і Белсампрамсаюзу зрывае пля забесьпячэньня рыбай працоўнага насельніцтва.**

**Прафсаюзы ў баку ад справы рабочага забесьпячэньня. Прапетарская грамад касьць не мабілізавана для барацьбы з прарывамі на фронце забесьпячэньня.**

**Мы чакаем адказу па ўсіх закранутых пытаньнях ад кіраўнікоў зацікаўлены устаноў і арганізацый.**

*„Каму патрэбна такая каапэрацыя і якая карысьць для рабочых ад яе манаполіі, калі яна ня выконвае задачы сур'ёзнага паляпшэньня рэальнай зарплаты рабочых". (Сталін)*

## Забясьпечым выкананьне дырэктыў партыі

ЦКК-РСІ сумесна з прафсаюзамі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі прыступіла да праверкі рабочага забесьпячэньня. У задачы гэтай праверкі ўваходзіць **выяўленьне і зьнішчэньне ўсіх тормазаў і перашкод, якія стаяць на шляху выкананьня дырэктыў партыі, у прыватнасьці апошніх дырэктыў бюро ЦК КП(б)Б па рабочым забесьпячэньні, па павышэньні рэальнай зарплаты.**

Генэральная лінія партыі, шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечваюць ліквідацыю нашых харчовых цяжкасьцяй, — цяжкасьцяй росту ў найбольш кароткі тэрмін. Але-ж бюракратызм, коснасьць, безініцыятыўнасьць, а часамі і шкодніцтва з боку асобных зьвеньняў нашага каапэрацыйнага і савецкага апарату затрымлівае працэс перамаганьня нашых часовых цяжкасьцяй і штучна пашырае іх разьмеры.

Спажывецкая каапэрацыя ня здолела выкапаць дырэктывы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб пашырэньні ахопу рабочага бюджэту. Наадварот, удзел каапэрацыі ў ахопе рабочага бюджэту за апошнія месяцы панізіўся. Спажывецкая каапэрацыя прапыліла безініцыятыўнасьць у вышукваньні мясцовых рэсурсаў, у замене дэфіцытных прадуктаў харчаваньня новымі недэфіцытнымі прадуктамі. Рабочая каапэрацыя нават ня здолела арганізаваць бесьперабойнае забесьпячэньне рабочага бульбай.

Паводле даных ЦСУ, каапэрацыя забясьпечыла рабочага бульбай у студзені 1930 г. толькі на 21,38 проц., у лютым—на 2,65 проц., у сакавіку—на 11,41 проц. і зразумела, што рабочаму даводзілася задавольваць значную частку сваіх патрэб у бульбе і плодагароднае не ў каапэрацыі.

У пастаноўцы грамадзкага харчаваньня каапэрацыя паказала найбольш выразна сваю непаваротлівасьць і безініцыятыўнасьць. Каапэрацыя нават ня здолела наладзіць бесьперабойнае забесьпячэньне рабочага-наведвальніка сталовак вегетар'янскімі стравамі з бульбы і іншых недэфіцытных прадуктаў. Якасьць харчаваньня і абслугоўваньня пагоршыліся.

**У гэтым няма чаго шукаць «аб'ектыўных прычын»—гэта проста гапавацяпства і бяздушныя адносіны асобных каапэратараў да запатрабаваньняў рабочых.** Тав. Сталін у сваім дакладзе па XVI зьезьдзе УсесКП(б) гаварыў, што апарат каапэрацыі больш за ўсё клапоціцца аб балянсе, у выніку чаго ён марудна праводзіць зьнижэньне раздробных цэн, ня глядзячы на катэгарычныя дырэктывы з боку кіруючых цэнтраў. Гэта адэнка т. Сталіна за зусім падыходзіць да спажывецкай каапэрацыі Беларусі, якая не змагла так наладзіць грамадзкае харчаваньне і хлебапячэньне, каб павялічыць рэальны ўзровень зарплаты, але дбала толькі аб камэрцыйным даходзе. **За першы квартал 1929-30 г. адны толькі цэрабкопы мелі 114,5 тыс. руб. прыбытку ад грамадзкага харчаваньня і 259,2 тыс. ад хлебапячэньня.**

Зразумела, што ніхто не дазволіць каапэрацыі **гэту галавацяпска-рвацкую палітыку цэн тлумачыць нейкімі «аб'ектыўнымі прычынамі».**

Адсюль першая задача праверкі рабочага забесьпячэньня: **выявіць сапраўдныя прычыны галавацяпскіх адносін і бюракратычнага ігнараваньня з боку асобных зьвеньняў каапэрацыі да запатрабаваньняў рабочых,** ужыўшы захады, якія-б абавязкова забясьпечылі выкананьне партыйных і ўрадавых дырэктыў.

Але-ж было-б няправільна, калі-б гэта праверка закранула адну рабочую каапэрацыю. Праверка павінна распаўсюдзіцца на ўсе гаспадарчыя і загатоўчыя арганізацыі, якія маюць заданьні ўраду па рабочым забесьпячэньні.

Першыя вынікі работы камісіі гавораць аб тым, што па вялікі жаль, гэтыя арганізацыі вельмі дрэнна выконваюць дырэктывы партыі па рабочым забесьпячэньні і не алічваюць адказнасьці за даручаную ім справу. Замест таго, каб дапамагчы спажывецкай каапэрацыі ў выкананьні задач, якія перад ёй стаяць, некаторыя гаспадарчыя і савецкія арганізацыі ставяць свае камэрцыйныя інтарэсы вышэй запатрабаваньняў рабочых.

Гандлярства, узаемная грызьня і канкурэнцыя паміж загатоўчымі арганізацыямі, перашкаджае пармальнаму ходу загатовак с.-г. прадуктаў, перашкаджае ажыцьцяўленьню раду мерапрыемстваў па пашырэньні харчовай базы.

Заўважаны злачынныя факты разбазарваньня загатоўленых с.-г. прадуктаў у раёнах. З матар'ялаў аршанскага акрганделю відаць, як у Чарэйскім раёне разбазарвалі загатоўленую жывёлу, мяса і інш. прадукты. Такія-ж матар'ялы ёсьць і ў Менскім акрганделі. Адсюль другая задача абсьледваньня: праверыць работу рэгулюючых, загатоўчых і інш. гаспадарчых арганізацый, спыніць усю гэту гандлярскую палітыку, прымусіць іх павярнуцца тварам да рабочага забесьпячэньня.

Перад камісіяй па праверцы і перад тымі грамадзкімі арганізацыямі, якія ў ёй прымаюць удзел, стаіць яшчэ адна важная задача—гэта стварыць пералом у вышукваньні новых мясцовых рэсурсаў для пашырэньня харчовай базы, у вышукваньні мерапрыемстваў па найлепшым і рацыянальным выкарыстаньні с.-г. прадуктаў, у прыватнасьці, ураджаю плодагароднины. Праз арганізаваныя пры камісіі ЦКК-РСІ спэцыяльныя брыгады спэцыялістых, праз конкурс на лепшую прапанову па пашырэньні харчовай базы мы павінны дабіцца такога становішча, пры якім кожны спэцыялісты, кожны рабочы-актывісты займаўся-б пытаньнем: як найхутчэй вышукаць і найлепш скарыстаць нашы мясцовыя рэсурсы.

Зразумела, што толькі пры актыўным удзеле грамадзкасьці, рабочых, спэцыялістых, каапэратараў, толькі тады, калі праверка будзе зьвязана з практычнай дапамогай яна дасьць сваю карысьць.

**Вэрба.**

Сумесна з рэпкай выцягнем шкоднікаў бюракратаў

## Баяцца запэцкаць рукі

Для пармальнага забесьпячэньня Менску агароднінай патрэбна прыцягнуць да [illegible] пытаньня ўвагу ўсёй нашай пралетарскай грамадзкасьці, каб прымусіць МЦРК і яго апарат перабудаваць сваю работу. Работнікі крам і сталовак МЦРК з вялікай неахвотай бяруць агародніну, баяцца запэцкаць рукі. З прычыны неарганізаванасьці транспарту, агародніна часта застаецца ляжаць на складзе і псуецца.

Праўленьне МЦРК павінна зараз-жа арганізаваць транспарт спэцыяльна для перавозкі агародніны. На заводах трэба зараз-жа правесьці растлумачальную кампанію сярод рабочых аб дастаўцы агародніны на дом. Трэба, каб рабочыя выказаліся па гэтым пытаньні і ўлесьлі свае прапановы.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі МЦРК павінны абвясьціць сябе ўдарнымі, каб выкананць дырэктывы партыі аб рабочым забесьпячэньні.

ЮЛОВІН

## Хаос і безадказнасьць

Забесьпячэньне рабочага спажыўца гароднінай у гэтым годзе, у сувязі з недахопам мяса і тлушчаў, набывае першачарговае значэньне.

**Свалачасова забясьпечыць рабочага спажыўца добраякаснай гароднінай—вось лёзунг дня для нашых загатоўчых арганізацый і спажывецкай каапэрацыі.**

Бюро ЦК КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове аб рабочым забесьпячэньні дае наконт гэтага зусім выразныя дырэктывы.

### Добрадушнае маўчаньне „Белплодагароднины"

Як-жа гэтыя дырэктывы партыі выконваюцца? Для праверкі выкананьня партыйных дырэктыў ЦКК РСІ, сумесна з рэдакцыямі газэт і прадстаўнікамі пра фарганізацый было зроблена абсьледваньне—«налёт» на рад загатоўчых арганізацый.

«Налёт» выявіў, што на рынку плодагародніны Беларусі дагэтуль **панаваў хаос і безадказнасьць.** У паўднёвых акругах Беларусі ўжо некалькі тыдняў як пачалася загатоўка раньняй бульбы і капусты, **але загатоўчых цэн на мясцох ня ведаюць.** Месцы штодзенна на працягу некалькіх тыдняў закідваюць Менск тэлеграмамі і заклікаюць паведаміць загатоўчыя цэны. Але дарэмна...

«Белплодагароднина», якая нядаўна выдупілася з нетраў Наркамгандлю, і прызвана арганізаваць і рэгуляваць забесьпячэньне працоўных гароднінай, добрадушна маўчала... З першых-жа крокаў сваёй работы «Белплодагароднина» ўзяла ў спадчыну ўсе адмоўныя моманты мінулай работы Наркамгандлю. Але нярэйдзем да фактаў.

25-га чэрвеня «Белплодагароднінай» была склікана спэцыяльная нарада для выпрацоўкі загатоўчых цэн на гароднину. На нараду зьявіліся прадстаўнікі Садсаюзу і спажывецкай каапэрацыі. Прадстаўнік-жа «Белплодагароднины», які склікаў нараду сам, як часта бывае ў такіх выпадках, зусім не зьявіўся. Нарада была сарвана.

7-га ліпеня «Белплодагароднінай» скліканца навуковая нарада. Два дні працаўнікі спажывецкай і садова-гародняй каапэрацыі пацелі і прасьлухвалі «белплодагароднины» кросны. Нарэшце, загатоўчыя цэны былі вызначаны.

### Бюракратычная каніцель

Можна было ўжо спадзявацца, што запатрабаваньні раёнаў аб прысылцы загатоўчых цэн будуць задаволены, але дарэмна. З гэтага дня пратакол з вызначанымі цэнамі пачаў вандраваць з «Белплодагароднины» ў Наркамгандлю і назад. Карацей кажучы, гэта бюракратычная каніцель працягвалася амаль, што тры тыдні. Толькі 20 ліпеня загатоўчыя цэны на гароднину былі разасланы адпаведным арганізацыям.

Прыблізна такі-ж малюнак і з плянам загатоўкі агародніны. Баланс ураджаю гароднины ў БССР вызначаны «Белплодагароднінай» аказаўся настолькі нягрунтоўным, што вылучаная для праверкі яго спэцыяльная камісія прымушана была яго забракаваць.

Ня лепш і з плянам загатоўкі садавіны. Пляну загатовак дагэтуль няма, як і загатоўчых цэн на садавіну. Такім чынам, «Белплодагароднінка» замест баявога штабу і кіраўніка наступленьня на агародніну рынку, нетаварэцщаў тормаз, які ўсімі спосабамі перашкаджае пармальнаму забесьпячэньню рабочага спажыўца.

### Больш клапоцяцца аб камэрцыйных прыбытках

Сьвежай агароднінай і садавінай мы можам карыстацца толькі на працягу некалькіх месяцаў. Таму перапрацоўка, засолка і закваска садавіны і гароднины мае вялізнае значэньне. Пастанова бюро ЦК КП(б)Б выразна паказвае, што Белкаапсаюз і Садсаюз павінны прыступіць да арганізацыі перапрацоўкі гароднины і садавіны. Але загатоўчыя арганізацыі і спажывецкая каапэрацыя замест выкананьня партыйных дырэктыў пачалі паміж сабой грызьню пры актыўным удзеле «Белплодагароднины». Дагавор на перапрацоўку і засолку агародніны паміж Садсаюзам і Белкаапсаюзам да 22 ліпеня яшчэ ня быў падпісаны. Прадстаўнікі гэтых арганізацый больш клапоцяцца аб сваіх балянсах і камэрцыйных прыбытках, чым аб забесьпячэньні рабочага спажыўца.

### Сьпіной да рабочага спажыўца

Немцы вялікія майстры па перапрацоўцы садавіны. З адкідаў садавіны і браку немцы выраблялі дасканалыя павідлы і інш. **У нас у БССР таксама можна было-б наладзіць выраб павідла** ў шырокіх разьмерах пры ўважлівых адносінах да гэтага спажывецкай каапэрацыі.

У гэтым годзе пры недахопе масла выраб павідла **мае асаблівае значэньне.** Але на жаль каапэрацыя яшчэ **не павярнулася тварам да рабочага спажыўца.** Найбольш характэрным прыкладам гэтага зьяўляецца Менскі ЦРК.

Мы ідзем, а вы на гатовы

У мінулым годзе Менскім ЦРК быў арганізаваны саматужны пункт па перапрацоўцы садавіны. З прычыны дрэннага абсталяваньня гэты пункт быў закрыты насьпя санітарнага агляду. У гэтым годзе, калі на перапрацоўку садавіны вызначаны спэцыяльны фонд цукру, МЦРК мабыць, зусім ня думае займацца гэтай справай. Ва ўсякім выпадку, дагэтуль для арганізацыі пункту на перапрацоўцы адкідаў садавіны нічога ня зроблена. У Белкаапсаюзе на запытаньне нашага супрацоўніка, чаму ў Менску не арганізуецца перапрацоўка садавіны, зрабілі зьдзіўленую міну і прабавалі запэўніць, што ўсе ў парадку.

Якое становішча з перапрацоўкай садавіны ў іншых гарадох БССР,—у Белкаапсаюзе фактычна ня ведаюць. Як забясьпечваецца рабочае насельніцтва БССР гароднінай, ці выконваюць загатоўчыя арганізацыі свае дагавары,—гэтага Белкаапсаюз таксама ня ведае. У Садсаюзе таксама не даб'емся выразнага адказу аб тым, як ідзе адгрузка гароднины для рабочых цэнтраў.

### Будаўніцтва хавалень пад пагрозай

Плян будаўніцтва хавалень агародніны ў БССР яўна перамешаны, бо калі-б ён нават і быў выкананы поўнасьцю, дык патрэбнасьць у хавальнях ня была-б задаволена. **Між тым, тэмпы будаўніцтва хавалень агародніны на сёнешні дзень прымушаюць нас біць трывогу.** У Менску ЦРК будуе 4 хавальні на 4.000 тон, вялікі склад на 40-50 вагонаў садавіны і паветку на 40 вагонаў бульбы. Будаўніцтва пачалі з вялікім спазьненьнем. Толькі нядаўна скончылі зямляныя работы. У сучасны момант будаўніцтва зрываецца з-за недахвату піламатар'ялаў, жалеза і рабочае сілы. Такое становішча мы маем і з будаўніцтвам на лініі Садсаюзу, ня гледзячы на аптымістычныя запэўненьні прапаўнікоў Садсаюзу. Белплодагароднина таксама захоўвае алімпійскі спакой. На тэлеграмы Саюзплодагароднины з Масквы аб тым, як забясьпечана будаўніцтва хавалень патрэбнымі матар'яламі, Белплодагароднина нават не адказвае. Дайшло да таго, што Саюзплодагароднина прымушана была зьвярнуцца ў ЦКК БССР з просьбай прыцягнуць да адказнасьці ўпоўнаважанага Белплодагароднины за ўпартае нежаданьне адказваць на запытаньні.

Для закваскі 25-ці вагонаў капусты, якія будуць даставлены ў Менск, МЦРК патрэбна 60 вялікіх кадушак, але будаўніцтва іх яшчэ не пачата. Паводле пляну МЦРК павінен засаліць 4.000 бочак туркоў. Бочкі ў ЦРК ёсьць, але не хапае абручоў для іх рамонту. Лесазагатоўчыя-ж арганізацыі покуль што затрымліваюць водпуск абручоў.

Крызіс з хавальнямі агародніны можна крыху палегчыць, наладзіўшы дастаўку агародніны рабочым на дом. У мінулым годзе некаторыя прэрабкопы, у тым ліку і Менскі, правялілі гэту справу. Цяпер гісторыя ізноў паўтараецца. МЦРК нічога яшчэ покуль што не зрабіў, каб спачатку азнаёміць з гэтым мерапрыемствам шырокія колы рабочых. Дагэтуль няма пляну перавозкі агародніны, ня вызначана сыстэма прыёмкі заказаў. Зразумела, што пры такіх адносінах гэта справа ізноў будзе праваленa.

### Прафарганізацыі ў баку

Да ўсяго гэтага балянсу **бязьдзейнасьці, адсутнасьці ініцыятывы і гапавацяпства** трэба дадаць яшчэ **інэртнасьць нашых прафэсыянальных арганізацый,** якія фактычна вельмі мала цікавяцца рабочым забесьпячэньнем і абмяжоўваюцца толькі ўхвальненьнем пастаноў і рассылкай цыркуляраў, **але не клапоцяцца аб тым, каб праверыць, як ажыцьцяўляюцца гэтыя пастановы.** Прафсаюзы не мабілізавалі грамадзкую думку для таго, каб напружэньць магчымасьць правалаў і прарываў на фронце рабочага забесьпячэньня.

Пачынаючы сёньня праверку рабочага забесьпячэньня, мы накіроўваем увагу пралетарскай грамадзкасьці на найбольш небясьпечныя яго вучасткі і чакаем водгукаў і прапаноў рабочых па ўсіх закранутых намі пытаньнях.

**Я. Палескі.**

## Птушніцтва—важнейшая крыніца рабочага забесьпячэньня

У Беларусі да гэтага часу вельмі мала ўвагі аддавалі птушніцтву і лічылі разьвядзеньне птушкі нейкай дробнай, другараднай справай. У нас недаацэньвалі значэньня птушніцтва, як сродку для ўзмацненьня забесьпячэньня гарадзкога рабочага насельніцтва, не гаворачы ўжо аб вялікіх экспартных пэрспэктывах.

Наша беларуская беспародная птушка —«етракатка» з прычыны сваёй малаарасьлаці дае вельмі мала мяса і да таго-ж не яйканосная. (70-80 яек у год). І гэта ў той час, калі амэрыканскія породы «Род-айланд» ці «Легорн» (якія, мяркуючы па зробленых досьледах, у нас лёгка акліматызуюцца—першыя ў паўночных краінах і другія — у паўдніёвых) даюць у два-тры разы больш і мяса і яек. З другога боку ў нас, пачынаючы з мінулага году, (у выніку разбазарваньня і іншых прычын) значна паменшылася птушніцкае пагалоўе, а значыцца і колькасьць яек.

Усё гэта ставіць перад намі вельмі важныя задачы. Трэба максымальна шпаркімі тэмпамі пашырыць гадоўлю птаства і перш за ўсё аднавіць дэфіцыт, а з другога боку паленшыць народу беларускай птушкі, у першую чаргу ў абагуленым сэктары сельскае гаспадаркі.

Тыя племянныя птушніцкія рассадзікі, якія ў нас цяпер ёсьць (дзьве гаспадаркі Белдзяржгандлю і дзьве гаспадаркі Белсельтрэсту), налічваюць усяго да 2.000 пародзістых матак і да 10-12 тысяч маладняка. Гэта можа нам даць да канца 1931 году да 120-150 тысяч пародзістых птушак. Ясна, што гэта вельмі мала, што такія маштабы работы ня могуць задаволіць нашых узросшых гаспадарчых патрэб. Тут-жа трэба дадаць, што Белкалгасцэнтр і Белмалжывсаюз мало што робяць, ці лепш кажучы, нічога ня робяць для разьвіцьця птушніцтва ў калгасах—гэта важная справа нелк праходзіць міма іх увагі.

Але адначасова з узмацненьнем і [illegible] птушніцкіх гаспадавальнікаў, нам трэба зараз-жа, неадкладна арганізоўваць прамыслова-адкормачныя птушніцкія гаспадаркі ў мэтах узмацненьня рабочага забесьпячэньня курыным мясам і яйкамі. У гэтых мэтах бюро ЦК КП(б)Б, а потым і эканомкарада ўхвалілі пастанову аб арганізацыі ў гэтым годзе 2 птушкаводных гаспадарак па 50 тысяч птушак ў кожнай —адну па лініі Наркамгандлю і другую па лініі Наркамзему.

Як-жа выканана гэтая дырэктыва партыі і ўраду? Белдзяржгандаль у гэту весну арганізаваў у Антонаве (пад Менскам) птушніцкую гаспадарку на 15.000 птушак. З гэтай яечнай фэрмы больніцы і дзіцячыя дамы забясьпечваюцца сьвежымі адпаведнымі яйкамі. Трэба сказаць, што Белдзяржгандаль занадта позна прыступіў да выкананьня пастановы аб арганізацыі птушніцкай гаспадаркі і апрача таго не скарыстаў усіх магчымасьцяй па загатоўцы птушкі. Белдзяржгандаль моцна прытрымліваецца сваіх дзяляцкіх экспартных функцый і вельмі туга пераключаецца на работу па рабочым забесьпячэньні.

Але як-бы там ні было Белдзяржгандаль ўсё-ж такі сёе-тое зрабіў і птушніцкую гаспадарку (хаця і невялікую і даволі прымітыўную) арганізаваў і рыхтуецца да пашырэньня сваіх птушніцкіх гаспадарках. Але вось Наркамзем і яго гаспадарчы орган—Белсельтрэст—**роўна нічога** не зрабілі для выкананьня гэтае пастановы партыі і ўраду. Мала таго, кіраўнікі Белсельтрэсту на паставленае ім з гэтай прычыны пытаньне толькі паціскалі плячыма:

— «аб такой пастанове ЦК мы нічога ня ведаем, племянныя гаспадаркі ў нас арганізаваны яшчэ ў мінулым годзе—што яшчэ мы павінны было зрабіць?»

Проста ня ведаем, як расцэньваць такую заяву кіраўнікоў Белсельтрэсту. Што гэта,—наіўнасьць, «сьвятая прастата», ці жаданьне ўхіліцца ад неабходнасьці выканаць канкрэтную пастанову кіруючых органаў?

А як-жа разгадаў Наркамзем на гэтую бязьдзейнасьць Белсельтрэсту? Пагаварыць з кіраўнікамі Наркамзему нам не давялося, нікога няма на месцы: хто ў адпачынку, хто ў камандыроўцы. І тады мы пачалі прыглядацца да палкі пратаколаў пасяджэньняў калегіі Наркамзему,—павінны-ж былі ставіцца на пасяджэньнях калегіі гэтыя пытаньні. Нашы пошукі, на жаль, далі вельмі мізэрныя вынікі. Аказваецца, што толькі на адным пасяджэньні калегіі (30 мая) ставілася справаздача Белсельтрэсту аб арганізацыі птушніцкай гаспадаркі. І вось запісаная пастанова калегіі—«пытаньне зьняць з-за непадрыхтаванасьці»—«паказаць Белсельтрэсту на гэтую не нармальнасьць». Вось і ўсё—больш ніякіх сьлядоў мы не адшукалі ў пратаколах Наркамзему.

Якія-ж у нас пэрспэктывы па разьвіцьці птушніцтва? Мы спынімся толькі на плянах Белдзяржгандалю, як на найбольш шырокіх. Белдзяржгандаль распрацаваў праект арганізацыі (пачынаючы з гэтага году) у Гомельскай акрузе буйнейшага птушка-яечнага камбінату на 375 тыс. птушак. У гэтым камбінаце мясцца на ўвазе арганізаваць і абсталяваць яечную фэрму, адкормачныя і убойныя пункты, халадзільнік. Гэта птушка-яечная фабрыка, на разьліках аўтараў праекту, павінна будзе даваць у год да 37 мільёнаў яек—ліфла, трэба сказаць, вельмі салідная. Апрача таго, Белдзяржгандаль праектуе колькасьць птушкі ў існуючых племянных гадавальніках (у Курасоўпчыне і ў Попляцку), даведзьці да 40-50 тыс. Далей праектуецца арганізацыя двух гусяводных гаспадарак (з давяраньнем ліку гусей на працягу 2-х год да 75.000 у кожнай) і адной гатаводнай гаспадаркі в давядзеньнем ліку гародзі («індыйскія бягучыя») на працягу трох год да 150 тысяч. Пляны гэтыя, зразумела, вялікія і шырокія,—толькі трэба будзе добра і энэргічна напрацаваць над іх выкананьнем.

Д.

## Конкурс--

### На лепшую прапанову па пашырэньні харчовай базы

Рэдакцыя газэты „Зьвязда"і праўленьне Белкаапсаюз згадзіліся з прапановай камісіі ЦКК РСІ па рабочым зз бесьпячэньні аб арганізацыі конкурсу на лепшую прапа нову па пашырэньні харчовай базы, па вышуканьні новы мясцовых крыніц рабочага забесьпячэньня па рацыльным скарыстаньні і пераапрацоўцы с.-г. прадуктаў, па замене дэфіцытных прадуктаў недэфіцытнымі, па найбольш хуткім эфэктыўным скарыстаньні ўкладаньняў у харчовую прамысловасьць, па найлепшым скарыстаньні прыгарадных зон і г. д.

### УМОВЫ КОНКУРСУ:

1) Прапановы прымаюцца да 5/VIII

2) Вызначаюцца чатыры прэміі: адна ў 500 руб., другая ў 250 руб. і дзьве па 125 рублёў.

3) Прапановы прымаюцца і не ў дэталёвым выглядзе але перавазжным правам карыстаюцца распрацаваны праекты.

4) Конкурснае журы складаецца з 3-х асоб (прадстаўнік ЦСПСБ, прадстаўніка каапэрацыі і прадстаўніка „Зьвязды з прыцягненьнем адпаведных спэцыялістых.

**Рабочыя, сяляне, служачыя, аграномы, тэхналёгі прымайце ўдзел у конкурсе!**

## Чаму зрываецца забесьпячэньне спажыўца рыбай

### Злачынная бязьдзейнасьць „Белрыбы" і Белсампрамсаюзу

### УЛОЎ РЫБЫ ПАНІЗІЎСЯ

Партыя і ўрад прынялі рад мер, каб наладзіць бесьперабойнае забесьпячэньне спажыўца рыбай. Было асыгнавана шмат грошай на гэту справу, рыбакам адданы цэлы рад льгот. Гэта дае права патрабаваць ад рыбнай прамысловасьці выкананьня адданых дырэктыў.

На справе-ж вельмі скромны план Белрыбы ў 30.000 цэнтнэраў за першае паўгодзьдзе выкананы ўсяго на 34 проц., прычым, па асобных акругах гэты процант зьніжаецца ўтрая (Бабруйская акруга 12,3 проц.). Апошняя дзесяцідзёнка ліпеня — катастрафічная, улоў рыбы значна панізіўся.

### АГІДНЕЙШАЯ ГРЫЗЬНЯ ПАМІЖ УСТАНОВАМІ

Чым гэта тлумачыцца? Ці ёсьць гарантыя, што плян у другім паўгодзьдзі будзе рэалізаваны з большым посьпехам?

Гэтым пытаньнем мы зацікавіліся пры нашым абсьледваньні. **Амаль ні адна дырэктыва ўраду арганізацыямі, зьвязанымі з лоўляй рыбы, у жыцьцё не праведзена. Сярод арганізацый, якім даручана забесьпячэньне краіны рыбкай прадукцыяй, адбываецца агіднейшая грызьня, яны звальваюць свае абавязкі адзін на аднаго; сярод іх панує паўнейшая бездадказнасьць у рабоце.** Наркамгандаль, Белрыба, Сампрамсаюз і Белкалгасцэнтр да гэтага часу яшчэ ня здолелі аб'яднаць сваю дзейнасьць. Недагаворванасьць, якая ёсьць у цэнтры, яшчэ больш адчуваецца ў акругах і раёнах. У выніку мы стаім перад рэальнай пагрозай невыкананьня пляну ўлову рыбы.

### АРЦЕЛІ БЕЗ СТАТУТУ

Галоўная дабыча рыбы павінна ісьці праз рыбацкія арцелі, якія арганізуюцца і аб'ядноўцца Сампрамсаюзам. Паводле вестак Белсампрамсаюзу на сёнешні дзень ёсьць 128 арцеляй замест 150, намечаных паводле пляну. Усе гэтыя арцелі дзіклія — арганізаваліся самацёкам. Ніякага кіраўніцтва арцелямі з боку Сампрамсаюзу і Белрыбы няма. Да гэтага часу яшчэ ня выпрацаваны статут рыбацкай арцелі.

Белсампрамсаюз лічыў непатрэбным распрацаваць статут, які падыходзіў-бы да ўмоў Беларусі. Быў узят статут, выпрацаваны для арцеляй РСФСР, перадрукаваны і накіраваны на месцы. У выніку гэты статут ня быў зацьверджаны ЭКАНА **і арцелі да гэтага часу працуюць бяз усяляпкага статуту. Плян улову не даведзены да арцелі.** У арцелях няма дысцыпліны, сацэпаборніцтва і ўдарніцтва. Панує п'янства і расхлябанасьць. Ёсьць факты, калі арцельшчыкі, ня гледзячы на добрае надвор'е, не выяжджаюць на ўлоў з тае прычыны, што сёньня, бачыце,—нядзеля.

### РЫБАКІ БЕЗ НЕРАТАЎ І СПЭЦВОПРАТКІ

Зусім дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем арцеляй патрэбнымі прыладамі, нератамі і спэцвопраткай. Белсампрамсаюз і Белрыба вядуць спрэчкі паміж сабой аб тым, хто павінен займацца забесьпячэньнем. А ў выніку рыбакі сядаюць бяз спэцвопраткі.

Згодна пастановы ЭКАНА, Белсампрамсаюз яшчэ ў красавіку павінен быў арганізаваць дзьве арцелі па вырабу нератаў. Наркамгандалем ужо адпушчана патрэбная колькасьць пянькі, але арцелі да гэтага часу яшчэ не арганізаваны **выключна па віне Белсампрамсаюзу.** Па думцы часта праўленьня Белсампрамсаюзу тав. Кушнэрова арцелі па вырабу нератаў ня змогуць быць арганізаваны раней чым зімой. Такім чынам, асеньні лоў рыбы таксама ня будзе забясьпечаны патрэбнымі нератамі.

Рыбак-індывідуальнік зусім выпаў з поля погляду як Белрыбы, так і Белсампрамсаюзу.

Улоў індывідуальніка, які ў нашых умовах займае яшчэ вельмі вялікае месца, зусім не ахоплены Белрыбай і Белсампрамсаюзам. Адзіночка-рыбак увесь свой улоў прадае на вольным рынку. Белрыба і Сампрамсаюз, які маюць спэцыяльныя фонды для прэміяваньня рыбакоў, іх не скарыстоўваюць і нічога ня робяць для ўцягненьня адзіночак-рыбакоў у прамысловую каапэрацыю.

### РАСПАД РЫБАЦКІХ БРЫГАД У КАЛГАСАХ

Дрэнна таксама абстаіць справа з арганізацыяй рыбнай лоўлі ў калгасах.

Арганізаваныя калгасныя рыбацкія брыгады нікім не абслугоўваюцца і ніхто на гэта не зварочвае ніякай увагі. У выніку мы маем шмат недагаловранасьцяй у рабоце і нават распад некаторых брыгад. Да гэтага часу яшчэ ня ясны пытаньне з аплатай рыбацкіх брыгад. У некаторых калгасах праўленьні гледзяць на брыгады, як на непатрэбную рэч. Ёсьць выпадкі, калі брыгады ў спрыяючае для лоўлі на двор'е пасылаюцца на іншыя работы.

Мясцовыя арганізацыі не зварочаюць зусім ніякай увагі на пытаньні ўзмацненьня рыбаўства: лоўлі рыбы галоўлі яе. Амаль ні у адным акрывыкаком РВК ня быў заслуханы дакла прадстаўніка Белрыбы аб ходзе лоўлі і раёне. Ніякіх мер па барацьбе з дрэнежным уловам рыбы не вядзецца.

### БУДАЎНІЦТВА САЖАЛКАВЫХ ГАС ПАДАРАК ПАД ПАГРОЗАЙ

Як-жа абстаіць справа з арганізацыяй новай сажалкавай гаспадаркі, з асваеньнем новых вадаёмаў?

Трэба адзначыць, што ўсе вадаёмы БССР вельмі засьмечаны і перашкаджаюць пармальнай лоўлі. Белрыба амаль нічога не зрабіла для таго, каб ачысьціць гэтыя вадаёмы. Аб асваеньні новых вадаёмаў ня прыходзіцца гаварыць.

Паводле пляну, сёлета павінна быць арганізавана сажалкавая гаспадарка в 2.000 гектараў. Сезон будаўніцтва сажалак канчаецца ў кастрычніку месяцы. Будаўніцтва новых сажалкавых гаспадарак знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Паводле заяў старшыні праўленьня Белрыбы, будаўніцтва тармозіцца таму што няма рабочай сілы добрага забесьпячэньня. Як нам удалося высьветліць слабы ход будаўніцтва тлумачыцца надвычайна кепскай работай Белрыбы. Рабочыя на будаўніцтве сажалкавай гаспадаркі прыраўнены ў забесьпячэньні да рабочых, якія працуюць на будаўніцтве галоўнейшага значэньня і ніякіх перабояў у іх забесьпячэньні няма.

Да гэтага часу Белрыба яшчэ ня высьветліла, як сьлед, пытаньня аб забесьпячэньні сажалак патрэбным пасадачным матар'ялам. Замест патрэбных для пасадкі 1.300 тыс. малькоў выдзелена ўсяго 750 тысяч. Ніякіх мер для забесьпячэньня недастаючай колькасьці малькоў Белрыба ня прымае.

Сёлета ў сажалках Белрыбы назіралася масавае зьнішчэньне рыбы. Якая прычына гэтага? Белрыба яшчэ ня высьветліла.

Некалькі слоў аб Наркамгандалі. Уся работа Белрыбы і Белсампрамсаюзу праходзіла бяз жаднага кіраўніцтва Наркамгандалю.

Такім чынам, мы бачым, што забесьпячэньне рабочых рыбай знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Савецкая грамадзкасьць павінна ўмяшацца ў гэту справу. Трэба вынайсьці канкрэтных винавацяў цягаціны ў забесьпячэньні рабочых арцелям. Плян лоўлі рыбы павінен быць поўнасьцю выкананы.

**Брыгада «Зьвязды»:**

АРКУС
НАТАНСОН
ЗМЫЧКОЎ
(рабочы «Камунара»)

# Вытворчую практыку лепшых заводаў—калгасам

## *Дабіцца рашучага пералому ў адносінах да „25-тысячнікаў“*

Неабходна дасканала вывучыць практыку работы рабочых-«25-тысячнікаў» у беларускіх калгасах, каб, на аснове гэтага матар'ялу, паленнець умовы работы і самацаваць 25-тысячнікаў на калгаснай рабоце, бо трэба-ж ведаць, што роля 25-тысячнікаў далёка яшчэ ня скончана. Калгасы будуць расьці і разгортацца, і для нас асабліва важна, каб тыя кадры рабочых, якія ўжо знаёмы з калгаснай работай, працавалі яшчэ некаторы пэрыяд часу ў тых калгасах, у якіх яны зараз вядуць кіруючую работу.

Як-жа працавалі нашы 25-тысячнікі, ці адпавядалі яны свайму прызначэньню, ці сустракалі яны падтрыманьне ў сваёй рабоце з боку розных арганізацый?—на ўсе гэтыя пытаньні дае адказ тое абсьледваньне, якое было праведзена ЦКК-РСІ.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што з тых 530 рабочых (ня ўлічваючы сюды 100 сормаўцаў), якія працуюць у беларускіх калгасах, пераважная большасьць слабе поўнасьцю апраўдала на рабоце і заваявала аўтарытэт сярод масы калгасьнікаў. На якіх вучастках калгаснай работы працавалі ў нас 25-тысячнікі? Вось некаторыя лічбы: 37 чал. працавала ў якасьці старшынь праўленьняў калгасаў, 75 — членамі праўленьняў, 70 чал. — старшынямі і членамі куставых аб'яднаньняў, 6 — у якасьці важатых трактарных калён і г. д.

Многія рабочыя-«25-тысячнікі» з самага свайго прыезду ў раён, у калгас ня мелі патрэбнага падтрыманьня з боку мясцовых партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый — гэта трэба сказаць цьвёрда і рашуча. «25-тысячнікам» ня былі прадастаўлены кватэры. У выніку гэтага былі выпадкі, калі некаторыя з іх у першы час былі прымушаны спыняцца нават у кулаксу (што іх хвалявала і абурала), валяцца ў лазьнях, у пажарных дэпо. Каапэрацыйныя арганізацыі або зусім адмаўляліся ад выдачы «25-тысячнікам» прадуктаў, або выдавалі ім на норме служачых, — насупраць катэгарычнай дырэктывы партыі. Аб забесьпячэньні бялізнай і абуткам ужо і гаварыць ня даводзіцца. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што «25-тысячнікі» па 3-4 месяцы ня атрымлівалі зарплаты ад сваіх прадпрыемстваў—цяганіна з зарплатай працягвалася доўга, такуль не ўмяшалася ЦКК-РСІ і не паклала канец гэтаму.

Німат «25 тысячнікаў» былі скарыстаны не па прызначэньні. Напрыклад, іх пакідалі на канцылярскай дорбнай тэхнічнай рабоце, або скарыстоўвалі ў якасьці радавых калгаснікаў. Так груба скажалася ў нас дырэктыва партыі аб скарыстаньні «25-тысячнікаў» на кіруючай рабоце.

Часта рабочыя «25-тысячнікі» ня мелі таварыскага падтрыманьня, парад і ўказаньняў, сувязі з сваімі прафэсыянальнымі органамі, з сваімі прадпрыемствамі.

Прыяжджае «25-тысячнік» у раён, у акругу, каб атрымаць патрэбныя ўказаньні, каб атрымаць матэрыяльную зарадку для далейшай работы, але ён нічога не знаходзіць апрача агульных дырэктыў. Напіша «25-тысячнік» ліст у свой фабком, у сваю прафэсыянальную арганізацыю, а лісты таму застаюцца ляжаць пад сукном, без адказу.

Вось адзін выпадак. Старшыню фабкому просяць паклапаціцца аб пакіўтай сям'і рабочага «25-тысячніка», а ён адказвае: «я і сваю сям'ю мала бачу з-за цілахвату часу, а тут я яшчэ буду займацца чужымі жонкамі!»

Заходзіць «25-тысячнік» — рабочы завод «Бальшавік», да сакратара партячэйкі пагаварыць, а той яму — «мне няма калі з табой гаварыць, прыходзь заўтра», — і так ён цягнуў 4 дні.

Пры ўсім гэтым — да гонару нашых «25-тысячнікаў» трэба сказаць, што настрої асноўнай масы іх — бадзёрыя, аптымістычныя, яны імкнуцца працаваць у калгасах.

Трэба моцна ўдарыць па тых арганізацыях і па тых асобах, якія дапусцілі грубыя, ня чулыя адносіны да «25-тысячнікаў» і скажалі дырэктыву партыі. —Аб гэтым трэба паклапаціцца ЦКК-РСІ. Неабходна рашуча зьмяніць адносіны да 25-тысячнікаў, акружыць іх нашай увагай і клапотамі, паленнець умовы іх жыцьця і працы, каб яны ў далейшым маглі праводзіць вялікую і карысную працу на ўзмацненьні і разгортваньні калгаснага руху.

**Л. Н—даў.**

## ЗА ДЗЕНЬ

— Калегія Наркамасьветы адзначыла, што работа Белдзяржвыдавецтва па выпуску падручнікаў для школ праходзіць нездавальняюча. Ёсьць пагроза зрыву своечасовага забесьпячэньня школ падручнікамі.

Ірапанавана ВДВ у 3-х дзённы тэрмін забясьпечыць друкаваньне падручнікаў.

***

Наркамасьветы пастанавіў і верасьня пачаць новы навучальны год ва ўсіх навучальных установах: ВНУ, рабфаках; тэхнікумах, прафшколах, масавых школах, лікпунктах.

Трэці выпускны курс пэдфаку БДУ пачне заняткі з 15 жніўня.

***

— Наркамат аховы здароўя пастанавіў арганізаваць у Менску **беларускі дзяржаўны інстытут Ахматмладу.** Мэта інстытуту—навуковае кіраўніцтва ўстановамі Ахматмладу і падрыхтоўка кадраў.

***

— НК аховы здароўя назначыў праф. Кроля М. Б. **дырэктарам беларускага дзяржаўнага мэдычнага інстытуту** (былы мэдфак БДУ).

***

— Да дня адкрыцьця ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўкі МАСФК, умесна з бюро фізкультуры ЦСПСБ, пастанавілі правесьці **масавы прабег фізкультурнікаў па горадзе.** Для мужчынскіх камандаў вызначаны прыз імя МАСФК, для жаночых—імя бюро фізкультуры ЦСПСБ?

***

— З 1-га жніўня на ўсебеларускім спартыўным стадыёне адкрываецца **Усебеларуская спартакіяда БВА.** На сканчэньні спартакіяды МАСФК наладжвае агульна-гарадзкую дэманстрацыю фізкультурнікаў разам з удзельнікамі спартакіяды.

***

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР пастанавіў адпусьціць на 1930-31 год 500 тысяч рублёў на **падрыхтоўку рабочых будаўнікоў і мэталістых.**

## Выраб абсталяваньня для сталовак і фабрык-кухань

Эканомнарада БССР, з мэтай забесьпячэньня прадпрыемстваў грамадзкага харчаваньня мэханізаваным абсталяваньнем, прапанавала ВСНГБ прыступіць да арганізацыі вытворчасьці абсталяваньня сталовак і фабрык-кухань з тым, каб у 1930—31 годзе забясьпечыць патрэбнасьць БССР у гэтым інвэнтары.

ВСНГБ і Белсамрамсаюзу даручана пацірыць выпрацоўку тэрмасаў і штогодна выпускаць іх на суму 720 тыс. руб.

## Рабочае забесьпячэньне чыгуначнікаў

У свой час Савет Працы і Абароны прыраўняў рабочых рамонтных заводаў, майстэрань і дэпо чыгункі Менску, Віцебску і Барысава ў галіне рабочага забесьпячэньня да рабочых прамысловых гарадоў. Цяпер экзамінуючая нарада БССР прыраўняла да іх яшчэ рабочых чыгункі г. г. Гомелю, Воршы, Магілеву і Жлобіну.

**АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ**

## Усе тэрміны прайшлі

### Калі будзе скончана пабудова кіно „Чырвоная Зорка“

У Менску будуецца кіно «Чырвоная Зорка». Кіно яшчэ «будуецца» і, на жаль, ня відаць канца работ.

Зусім правільнае абурэньне пралетарскай грамадзянскасьці супроць гэтакіх чарапашыных тэмпаў.

Згодна дагавору, Белжылсаюз павінен быў пабудаваць і здаць кіно ў сьнежні месяцы 1929 г. Адкрыць кіно збіраліся і студзеня 1930 г. Любан, як бачыце, праваліўся.

Усе надзеі ўскладаліся на 1 мая. Спадзяваліся, што да гэтага тэрміну ўсё будзе закончана.

Белжылсаюз і не шмапае. Праваліліся адкрыцьцё і 1 мая.

Потым адкрыцьцё кіно-тэатру было прыстасавана да 11 ліпеня — дня вызваленьня Беларусі.

Спэцыяльна ўдарным парадкам падрыхтавалася сьвяточная праграма гукавога кіно. З надзвычайна вялікімі цяжкасьцямі, пры дапамозе розных арганізацый, атрымалі апаратуру гукавога кіно. Але Белжылсаюз і тут сарваў тэрмін адкрыцьця. Напярэдадні ліпеня-ўскага сьвята, ячэйка КП(б)Б БДК (былі і адказныя прадстаўнікі Белжылсаюзу) адзначыла недапушчальныя адносіны Белжылсаюзу да будаўніцтва і справу перанесла ў вышэйшыя партыйныя органы. Выязная камісія ВСНГБ, агледзела ход будаўніцтва і вызначыла апошні тэрмін пабудовы 15 жніўня 1930 г.

Наогул, мы цяпер стаім перад небясьпекай зрыву адкрыцьця кіно у 1930 г.

Белжылсаюз не ўзмацняе тэмпаў работы і, такім чынам, пазбаўляе пралетарскую грамадзкасьць гукавога кіно. Апроч таго ён непамерна павялічвае выдаткі на будаўніцтва кіно.

Маўчань далей нельга. Адкрыць кіно на 12 месяцаў пазьней тэрміну — гэта злачынства.

Мы ўзьнімаем пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі — выявіць вінаватых, пацікаваць глыбей гэтай справай і прыцягнуць, каго сьлед, да адказнасьці.

**АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ**

## Водпуск лесамарар'ялаў сялянскаму насельніцтву

Эканамічная нарада БССР пакінула на 1930—31 год існуючы парадак задавальненьня патрэб сельскага насельніцтва ў лесаматар'ялах. Драўніна будзе выдавацца шляхам водпуску лесу на карані. Калі ў асноўных лесазагатоўцах ёсьць даволі загатоўленай драўніны, яна павінна адпускацца насельніцтву ў гатовым выглядзе на месцы загатовак. Пры водпуску драўніны на карані ўстаноўлены наступныя скідкі з поўнага сабекошту: калгасам і бядняцкай частцы насельніцтвам — 60 проц., гаспадаркам, якія плацяць с.-г. падатак бяз процантнай надбаўкі — 35 проц. Гаспадаркам, якія плацяць сельгаспадатак з процантнай надбаўкай, скідка не даецца. Гаспадаркам, якія плацяць с.-г. падатак у індывідуальным парадку, драўніна для новага будаўніцтва ня адпускаецца, а для рамонту—толькі з дазволу райвыканкомаў.

Для гэтай катэгорыі гаспадарак драўніна адпускаецца на пэнах, устаноўленых для асноўных загатоўцаў, з надбаўкай у 50 проц.

Для задавальненьня драўнінай найбольш маламоцных груп насельніцтва калгасаў і вёсак, арганізаваны фонд дармовых ільготных водпускаў лесу на 200 тыс. руб. і фонд водпуску лесу ў крэдыт — на 600 тыс. руб.

За лік гэтых фондаў маюць права на атрыманьне драўніны чырвоныя партызаны, былыя чырвонаармейцы, бяднейшыя сем'і вайскавослужачых, працаўнікі раённай і сельскай міліцыі, інваліды працы і вайны, бядняцкія сялянскія гаспадаркі і асобы, пацярпеўшыя ад стыхійных бед.

# Тэатр і музыка

## Справаздачны канцэрт Белрадыёцэнтру

20/VII ў летнім тэатры саду «Прафінтэрн» ударная брыгада артыстых рафыёцэнтру рабіла мастацкую справаздачу перад рабочай аўдыторыяй. Брыгада выканала амаль усе музычныя і вакальныя нумары, з якімі яна выступала ў рабочых, калгасьнікаў і чырвонаармейцаў у часе свайго падарожжа па Беларусі.

У кароткім уступным слове музычны кіраўнік Белрадыёцэнтру т. Любан расказаў аб шляхах беларускае народнае песьні і рабоце шасьці брыгадзіраў.

Канцэртанты выканалі сьпевы прыгонныя, з ноткамі глыбокага жалю, пакуты; сьпевы складзеныя ў часы белапанскае акупацыі і песьні сёньняшняга дня, поўныя захапленьня сацыялістычнаю будоўляю на вёсцы.

Усе нумары папярэдня растлумачваліся т. Любанам. Сьціслы сацыяльны аналіз, належная ацэнка кожнае рэчы, спрыялі лепшаму замацаваньню ўражаньня.

Брыгада зрабіла вялікую справу, аб'ехаўшы з цікавым, пераважна фальклёрным матар'ялам самыя далёкія куткі БССР. Яна паведала калгасы Полаччыны, рабочых Віцебску, пабывала ў чырвонаармейскіх лягерах.

Брыгадзе ня шкодзіла-б перанесьці сваю працу ў нашы прафсаюзныя клюбы, каб азнаёміць як мага шырэйшыя рабочыя колы з творчым разьвіцьцём беларускае народнае і рэвалюцыйнае песьні.

**Юр. Л—ны.**

## ДОБРАБЫТ МЕНСКУ

Аддзел Добрабыту Менкамгасу скончыў пляніраваньне і забрукаваньне Барысаўскага тракту да ўсебеларускай выстаўкі. Таксама ўжо скончана брукаваньне Кірсанаўскай дарогі. Зараз праводзіцца забрукаваньне шляху да цагэльняў у Тычынцы.

## ПРЫЕМ У ВІЦЕБСКІ І ІНДУСТРЫЯЛЬНЫ ІНСТЫТУТ

Увосень гэтага году ў Віцебску індустрыяльна-пэдагагічны інстытут будуць прыняты на фізыка-тэхнічнае аддзяленьне 70 чал. і на хэміка-тэхналёгічнае—60 чал.

Да гэтага часу падана толькі 29 заяў.

## ПАДПІСКА НА ЗАЁМ У БЕЛАРУСКІМ ВАНДРОЎНЫМ ТЭАТРЫ

90 проц. калектыву артыстых Беларускага Вандроўнага Тэатру на агульным сходзе, які адбыўся 23 ліпеня, падпісаліся на пазыку «Пяцігодку—за чатыры гады» у разьмеры двухтыдзёвага заработку.

Тэатр выклікае на сацпаборніцтва па падпісцы польскі дзяржаўны тэатр, жыдоўскі дзяржаўны вандроўны тэатр, рабочы тэатр ЦСПСБ і «сінюю блюзу» саюзу сельгасрабочых.

# ШТО ЗРОБЛЕНА ПА ЛІСТОХ РАБСЕЛЬКОРАЎ

**Чужому элемэнту ня месца ў партыі.**

**Рабселькор** у адным з сваіх допісаў пісаў, што **т. Шчарбёнак** ашуканствам уступіў у партыю, бо ён эксплуацыя сынам заможніка і ўвесь час трымае сувязь з кулацкімі элемэнтамі, зацісканае самакрытыку і г. д.

Расьсьледваньнем гэтыя факты пацьвердзіліся. Пастановай парткалектыву **«Дняпроўскай Мануфактуры» Шчарбёнак выключаны з партыі.**

***

У артыкуле **«Правы ўхіл на практыцы»** пісалася аб недарэчнасьцях у рабоце бюро ячэйкі КП(б)Б **шчотачнай фабрыкі** (Менск).

Паводле паведамленьня **Кастрычніцкага РК КП(б)Б** гэтыя факты адпавядалі сапраўднасьці. **Бюро ячэйкі за бязьдзейнасьць распушчана.**

***

Рабселькоры пісалі аб дрэнным рабоце **Плешчаніцкага і Нова-Барысаўскага** аддзяленьняў сувязі.

Расьсьледваньнем факты пацьвердзіліся. **Загадчыкі вышэйазначаных аддзяленьняў сувязі з работы зволены.**

***

**Менскі акруговы інспэктарыят асьветы** паведаміў, што допіс адносна настаўніка **Строгіса** (Самахвалавічы), які абвінавачваецца ў зьбіваньні вучняў і г. д., расьсьледваньнем пацьвердзіўся. **Строгіс з работы зьнят.**

**ВЫМОВА—ЗА БЮРАКАРАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ.**

У № 47 газ. **«Зьвязда»** ад 25 лютага 1930 г. быў зьмешчаны артыкул **«Флірт бухгалтароў»**, у якім пісалась аб бюракратызме начальніка Галоўначадкасы **т. Падольскага** і бухгалтара **Дубоўскага**.

РСІ, разглядзеўшы гэты допіс, факты пацьвердзіла. Т. т. **Дубоўскаму і Падольскаму** за бюракратычныя адносіны да акрэшчадкас абвешчана вымова.

Апрача гэтага **НК-РСІ** ў сваёй пастанове папярэджвае ўсе установы і арганізацыі, што устанаўленьне і патрабаваньне ўсякіх форм сыстэматычнай справаздачнасьці і анкет павінна рабіцца, паводле **пастановы ЦВК і СНК СССР ад 30 красавіка 1927 г. і ЦВК і СНК БССР ад 5 студзеня 1929 г.**

**АДДАНЫ ПАД СУД ЗА АБАРОНУ АРАНДАТАРАЎ**

Тав. **Р.** у адным з сваіх артыкулаў паведаміў аб безгаспадарчасьці ў **Копыскім** райкамгасе і аб вялікай запазычанасьці за былымі арандатарамі млыну. З боку загадчыка камгасу і прэзыдыуму **Копыскага** РВК ніякіх мер ня прымалася да спагнаньня нядоімак і зьнішчэньня безгаспадарчасьці.

Паводле паведамленьня **Аршанскай** РСІ, гэтыя факты адпавядаюць сапраўднасьці.

РСІ справу перадала ў пракуратуру для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

**ЦП саюзу саўгандальслужачых** сумесна з рэдакцыяй «Нашей Газеты» склікае 25 ліпеня а 8 гадз. веч., у **памяшканьні клюбу саўгандальслужачых** агульна-гарадзкую канфэрэнцыю чытачоў «Н. Г.» з парадкам дня:

**1. Даклад рэдакцыі «Нашей газеты»** (дакэ. Раубэ).

Пасьля дакладу — мастацкая частка.

Яўка ўсіх рабкораў, чытачоў «Нашей газеты», членаў рэдкалегій насьценных газэт, арганізатараў падпіскі, арганізатараў па культпрацы пры МК і старшынь МК — абавязкова. Запрашаюцца члены саюзу саўгандальслужачых.

Парттройка ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 2-га жніўня у 6 з пал. г. увечары будуць разглядацца справы наступных т. т.:

Сосніна, О. Б.; Войнава, В. Л.; Станкевіча, Р. С.; Несьцяранкі, А. К.; Аддера, В. М.; Прэсмана, З. Ю.; Сьмірнова, П. Р.; Іяралева, Я. Х.; Разьдзерва, З. С.; Шаўкаўца, А. Л.; Фрыдмана, А. Н.; Ларчанкава, Я. Ф.; Караташа, Я. С.; Цапкова, У. Ц.; Гінзбурга, Г. Н.; Каршака С. В.; Зайцава, У. С.; Зуевіча, Н. Ц.; Грэбнева, Г. Х.; Лабаноўскага, Г. С.; Чачура, Е. А.; Агапава, М. Т.

Памянёныя т. т. запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Праезд за ўласны кошт. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, якія праводзілі чыстку, і сакратары, тых ячэек дзе лічацца на вучоце памянёныя таварышы, якія знаходзяцца ў Менску.

**СЕНЬНЯ**

— **Сад Асьветы.** Кіно «Осужденные». Пачатак роўна а 10 гадз. веч. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў Дом Асьветы.

**ЗАЎТРА**

— **Фота-выстаўка.** А 8 гадз. веч. у залі насяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца зачыненьне Усебеларускай фота-выстаўкі. Запрашаюцца ўсе фота-гуртукі і асобныя фота-аматары — члены саюзу. У парадку дня: вынікі выстаўкі і раздача ўзнагарод.

— **Дом Асьветы наладжвае** вялікую экскурсію асьветнікаў з падшэфнай чырвонаармейскай часткай за горад у Дразды. Увесь час іграе духавы аркэстр, будзе працаваць буфэт і будуць паказаны дасягненьні Чырвонай армії і масавая гульня. Збор у Садзе Асьветы а 9 гадз. раніцы.

**Час. вып. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.**


Кіно-тэатр „Культура“
З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ 2-гі ТЫДЗЕНЬ
ДАЧКА ГІЛЯНА
драма ў 8 частках
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
апошняе дасягненьне тэхнікі жывога кінематографа
НУДОЎНЫЯ ЦЕНЫ
Дзеля ўспрыняцьця эфэкту кожны глядач атрымоўвае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно (на сабекошт) 7 к. за штуку.
Пачатак сэансаў: 7 гадз., 9 гадз., 10 г. 30 м.

КІНО ПРАЛЕТАРЫЯНАЛ
СЕНЬНЯ І ШТОДНЯ
нямецкі фільм
ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ (КРЫЖАПРЫСЯГА)
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 г. 30 м.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
ЧАЛАВЕК АГНЮ
Пачатак 1-га сэансу а 7 г.
Каса адкрыта з 5 г.

КІНО-САД
Лепшая камэдыя сэзону
ЛЯЛЬКА З МІЛЬЕНАМІ
Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.
Каса адкрыта з 6 гадз. 30 м.

КІНО „СПАРТАК“
АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК
ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА
тэатрычны кіно-фільм у 8 част.
У галоўнай ролі ПОЛІ НЭГРЫ
Пачатак сэансаў:
1-га сэансу а 7 г.,
2-га сэансу а 9 г.,
3-га сэансу а 10 г. 45 м.
КАСА—ад 6 гадз.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
у дадатак да абвесткі ў газ. «Зьвязда» ад 18/VII г. г. даводзіць да ведама ўсіх, што
МАСКОЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІКУМ КІНЕМАТАГРАФІІ
РЭАРГАНІЗАВАН
у маскоўскі дзяржаўны ІНСТЫТУТ КІНЕМАТАГРАФІІ
Белдзяржкіно пасылае ў паказаны Інстытут 4-х чалавек на рэжысэрскі факультэт
Усе жадаючыя паступіць павінны адпавядаць агульным патрабаваньням да паступаючых у вышэйшыя навучальныя установы і апрача таго праходзяць іспыты для вызначэньня іх прафэсійнай годнасьці.
Прыём заяў у Белдзяржкіно праводзіцца да 28-га ліпеня г. г. уключна.
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

Макаронная фабрыцы імя Леніна ў г. Нова-Барысаве
патрабуюцца на сталую працу 1) інжынэр-мэханік або тэхнік-мэханік, 2) цяплотэхнік.
— АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ —

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН“
Сёньня, 25 ліпеня для заводу „Кастрычнік“
КАНЦЭРТ сімфанічнага аркестру БЕЛРАДЫЁЦЭНТРУ
пад кіраўніцтвам МІХАЙЛАВА
з удзелам салістых Т у х (скрыпка), Кухараў (барытон).
— Пачатак а 9 гадз. веч. —

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
ВЫШЛІ з ДРУКУ і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
Сталін.— Палітычная справаздача ЦК XVI зьезду УсеКП(б).
Стар. 113. Цана 25 к.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ БССР
*апавяшчае, што пастановай ураду,*
ТЭРМІН РЭАЛІЗАЦЫІ ВЭЛЕСЫПЭДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАУ
ПРАЦЯГНУТ

да 15 жніўня
10 проц. вэлёсыпэдаў 4-й сэрыі — жаночыя.
Працоўныя, сьпяшайцеся набыць у растэрміноўку вэле-абавязацельства для атрыманьня вэлесыпэду.
Калектыўная і індывідуальная падпіска прымаецца ва ўсіх ашчадкасах.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
паведамляе, што 25 ліпеня ў буд. Палітэхнікуму (вул. Карла Маркса, 2-гі паверх, актавая заля)
адчыняецца папярэдняя выстаўка ПРАЕКТАЎ,
якія паступілі
на конкурс кіно і тэатру ў Воршы
Выстаўка будзе адчынена 25, 26 і 27 ліпеня в 12 г. да 3-х і з 5 г. да 9 гадз.
Запрашаюцца рабочыя, інжынэрна-тэхнічны персанал, будаўнікі, працаўнікі мастацтва і інш.
УВАХОД ВОЛЬНЫ. БЕЛДЗЯРЖКІНО

Для здачы АБВЕСТКІ ў газету „ЗЬВЯЗДА“ званоце па тэл. 7-81

ДА АСЕНЬНЯГА ПРЫЕМУ Ў ВТНУ
БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ
рэарганізуэмы, згодна пастановы СНК БССР у 4 самастойныя інстытуты: ХЭМІКА-ТЭХНАЛЁГІЧНЫ, БУДАЎНІЧЫ, МЭХАНІЧНЫ і ЭЛЕКТРАТЭХНІЧНЫ
— ПАВЕДАМЛЯЕ, —
што прыём заяў на ўсе 4 факультэты працягнут да 1-га жніўня г. г.
Не пазьней 1-га жніўня ўсе курсы па падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны прадставіць сьпісы з дакумантамі слухачоў, якія накіроўваюцца ў палітэхнічны інстытут, згодна з зьвёрткі, Народным Камісарыятам Асьветы.
Курсы, якія не прадставяць гэтых сьпісаў, мэханічна выключаюцца з агульнага кантынгенту прыёму ў палітэхнічны інстытут.
Аб дні пачатку прыёму іспытаў будзе паведамлена дадаткова.
БЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ.

*У кнігарнях*
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА І СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ
*прадаюцца новыя кнігі*
АНДРЭЯ АЛЕКСАНДРОВІЧА
1. Пазма імя Вызваленьня.—Цана 30 кап.
2. Установка (зборн. вершаў).—Цана 30 кап.
3. Гудкі (зборн. вершаў).—Цана 20 кап.

ПОЛАЦКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАФТЭХШКОЛА АГНЯТРЫВАЛАГА БУДАЎНІЦТВА
абвяшчае ПРЫЁМ на першы курс
Школа рыхтуе высокакваліфікаваных рабочых, дзесятнікаў і тэхнікаў па агнятрывалым будаўніцтве. Тэрмін навучаньня 2 гады. За гэты час слухачы школы праходзяць наступныя прадметы ў аб'ёме сярэдняй навучальнай установы:
1. Тэхнічная матэматыка і фізыка.
2. Хэмія, мэханіка і матэрыялазнаўства.
3. Будаўнічае мастацтва і агнятрывалае будаўніцтва.
4. Тэхналёгія і грубая кераміка.
5. Графіка. Вуточнае палажэньне.
6. Нямецкая мова.
7. Беларуская мова і літаратура.
8. Грамадазнаўства: а) гіст. клясавай барацьбы ў сувязі з гіст. УсеКП(б); б) палітэканомія і эканомпалітыка; в) асноўныя пытаньні марксызму і ленінізму.
Школа на 1930-31 нав. год прымае 80 чалавек
УМОВЫ ПРЫЁМУ
У школу прымаюцца асобы ўзростам ад 15 год, скончыўшыя поўны курс 7-хгадав. школы, альбо маючыя агульна-адукацыйную падрыхтоўку ў гэтым-жа аб'ёме. Таварышы скончыўшыя 7-дкі, ШСМ, прафшколы на базе 4-х годкі і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы і агнятрывалую школу, прымаюцца бяз іспытаў незалежна ад часу скончэньня.
Прыём заяў з 20 ліпеня па 20-е жніўня г. г.
Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі пры школе з наступнымі дакумантамі: 1) дакумант аб узросьце (мётрыка); 2) аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын); 3) аб асьвеце; 4) 2 засьведчаныя фатаграфічныя карткі; 5) мэдычнае засьведчаньне; 6) дакумант аб матар'яльным і сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў да і пасьля рэвалюцыі; 7) даведка аб карыстаньні правам выбарчага голасу; 8) для сялян акладны ліст па 29-30 год, а для саматужнікаў патэнт; 9) анкету засьведчаную прафэсыянальнымі, або савецкімі арганізацыямі; 10) паштовых марак на 20 кап.
ТЭРМІН ІСПЫТАЎ І ЗАЛІЧЭНЬНЯ з 20-га па 25 жніўня. Аб выніках прыёму паведамляюцца ўсе асобы падаўшыя заявы. Стыпэндыяй і інтэрнатам будуць забясьпечаны 70-80 проц. слухачоў. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка.
Адрас канцылярыі: г. ПОЛАЦАК, Ленінская 48.
ПРАФШКОЛА.

УВАГА!
З 20 ліпеня АДКРЫТЫ фатаграфіі Белдзяржкіно,
Савецкая, 73 і Савецкая, 81.
— У фатаграфіі працуюць лепшыя майстры. —
Заказы выконваюцца дакладна і акуратна.
Фатаграфіі адкрыты штодзенна з 10 г. раніцы да 6 г. веч.
Просьба да ўсіх заказчыкаў б. фатаграфіі працалектыву да 1 жніўня атрымаць старыя заказы.
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК
у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,
атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА“
па месцы знаходжаньня ў водпуску,
паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА»
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Газэта будзе дасылацца па новым адрасе
без асобнай даплаты.

ВЫШАЎ з ДРУКУ, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж
№ 5 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ“ № 5
ЧАСОПІСЬ ПАЛІТЫКІ І ПРАКТЫКІ ПАРТ. ПРАЦЫ
ОРГАН ЦК КП(б)Б.
ЗЬМЕСТ № 5:
Я. ВАСІЛЕВІЧ. КП(б)Б у барацьбе за бальшавіцкую лінію.
А. СЯНКЕВІЧ. Барацьба з ухілямі ў нацыянальным пытаньні і нацработа.
С. БУДЗІНСКІ. Тры праблемы.
А. КУРЦІК. За бальшавіцкую якасьць нашага друку.
Р. КАРШАКЕВІЧ. Вынікі калгаснага будаўніцтва БССР у веснавую сельскагаспадарчую кампанію 1930 году.
Л. ЯКАЎЛЕЎ. Апартуністыя ў барацьбе супроць партыі.
Ц. ПРАКОПЧЫК. Аб тэмпах калгаснага будаўніцтва на Беларусі ў сувязі са скажэньнямі партыйнай лініі ў гэтым пытаньні.
Матар'ялы і дакументы. Рэзалюцыя XIII зьезду КП(б)Б па дакладу тав. Мануільскага і па дакладу тав. Трылісэра.
Выпісвайце, чытайце „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ“.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА канторай газэты «Зьвязда», паштовымі аддзяленьнямі, контрагентствам друку, пэрыядсэктарам Белар. аддзел. ГІЗ РСФСР, кнігарнямі Белдзяржвыдавецтва, Белкаапсаюзу.
«БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ» (12 НУМАРОЎ) КАШТУЕ:
на 1 год—4 руб. 20 кап.
на 6 м.—2 руб. 10 кап.
на 3 м.—1 руб. 05 кап.
на 1 м.— — 35 кап.
Кошт асобнага нумару 60 кап.
Адрас рэдакцыі: МЕНСК, ЦК КП(б)Б.